№6 (364) 11 лютага 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Куды плывеш, Беларусь?**
Эсэ Сяргея Харэўскага.
старонка 4

**Саамы па сабе**
Андрэй Катлярчук зь землякамі Санта-Клаўса.
старонка 7

**Цякуць мазгі**
Куды зьнікаюць беларускія навукоўцы.
старонкі 8–9

**Дзень закаханых**
Дзе варта быць, куды можна ехаць, прызнаньні ў вершах, «Каханьне ў нашым кусьце».
старонкі 13–15

## Сідорскі—Касьянаў: фіяска

**У часе перамоваў Касьянава й Сідорскага ў Маскве, паведамляе газэта «Ведомости», пазыцыі бакоў ня толькі ня зблізіліся, але і разышліся мацней.** Беларусы адмовіліся ад адзінага эмісійнага цэнтру, што было ўзгоднена раней, і зноў настойвалі на стварэньні раўнапраўнае міжбанкаўскай рады. Карэктуецца і ранейшая саступка наконт «Белтрансгазу». У сярэдзіне студзеня Менск пагадзіўся на роўны падзел пакету акцыяў між беларускім урадам і «Газпромам». Учора было аб'яўлена, што да беларускай долі дадасца яшчэ 1% акцыяў, якія атрымае працоўны калектыў.

## Аксана Новікава амніставаная

**У красавіку 2003-га гэтую дысыдэнтку пакаралі за абразу прэзыдэнта двума гадамі пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай.** Ад калёнii ўратавала малое дзіця, якое не было б з кім пакінуць. Новікава радая, што яе амніставалі, але зьбіраецца й надалей выходзіць на вуліцы ды ладзіць акцыі пратэсту супраць парушэньняў дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. На Аксане вісіць яшчэ штраф 7 мільёнаў 875 тысяч рублёў.

## «Пяцёрка» ў Вашынгтоне

**Лідэры Народнай кааліцыі 5+ працягваюць сустрэчы ў Вашынгтоне.** Іх прынялі сьпікер палаты прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША Дэніс Хастэрт і намесьнік дзяржсакратара ЗША Рычард Армітыдж. У візыце бяруць удзел кіраўнікі партый «Пяцёркі», а таксама генэрал Валеры Фралоў і Алесь Мілінкевіч. Гаворка ідзе перадусім пра міжнародную палітычную падтрымку беларускіх дэмакратаў з боку ЗША. «Гэтая падтрымка неабходная для таго, каб пляняваны Лукашэнкам выбарчы фарс стаўся сапраўднымі выбарамі», — заявіў Вінцук Вячорка з Вашынгтону ў інтэрвію радыё «Свабода».

## Уэсьлі Кларк зьняўся

**Уэсьлі Кларк, былы кіраўнік сілаў NATO ў Эўропе, адмовіўся ад далейшага ўдзелу за права балятавацца ў прэзыдэнты ЗША ад Дэмакратычнае партыі.** Генэрал, продак якога паходзіў зь Беларусі, у чарговым этапе перадвыбараў ізноў саступіў Джону Керы.

МБ

# Гэта было крута



Уладзімер Ваўчкоў
Старонка 3.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Ордэн Мужнасьці даюць «за выключную адвагу і подзьвігі, зьдзейсьненыя ў экстрэмальных абставінах». Хоць ніякага геройства ў сваім фінальным двубоі зь Южным Уладзімер ня бачыць. Наадварот, спадзяецца, што больш такіх сытуацый ня будзе: «З шашкай нагала можна праскачыць раз, на другі ўжо ня ўдасца. Папросту сытуацыя склалася так, што трэба было выходзіць і максымальна добра рабіць сваю працу». На прэс-канфэрэнцыю ў аўторак Ваўчкоў прыйшоў нягалены і ледзь стрымліваў пазяханьні. Ня тое сур'ёзны Мірны, новы твар «Вэлкаму», — гладкі і падцягнуты.**

**Сваіх ордэнаў спартоўцы пакуль ня бачылі, афіцыйнае ўзнагароджваньне адбудзецца пазьней. Ордэнам Айчыны да Мірнага і Цяцерына былі ўзнагароджаныя генпракурор Віктар Шэйман, гімнаст Іван Іванкоў, супрацоўнік Рады Бясьпекі Валянцін Нікіцін, маёр КДБ Саковіч, міліцыянт Міхаіл Дзям'янаў. Апошні — пасьмяротна, за абясшкоджаньне асабліва небясьпечных злачынцаў. Кампанія невялікая... Мірны і Цяцерын сьмяюцца, што цяпер будуць карыстацца льготамі Героя Савецкага Саюзу. Ордэн «За асабістую мужнасьць» да Ваўчкова атрымлівалі два палкоўнікі міліцыі — за асаблівыя заслугі, праяўленыя падчас аховы грамадзкага парадку (1998), — і сэржант міліцыі за выратаваньне людзей і маёмасьці падчас ліквідацыі пажару на барысаўскай чыгунцы. Старонка 3.**

## Брэх ягнятаў

**Ня першы раз выданьні, якія маюць статус дэмакратычных і незалежных, бянтэжаць нас несправядлівымі і на першы погляд незразумелымі нападамі на сваіх жа паплечнікаў.** Тлумачэньні кшталту своеасаблівага разуменьня «плюралізму і свабоды слова» тут не падыходзяць. Ёсьць рызыка назаўсёды закансэрваваць сярод нас стан узаемнага недаверу і міжусобнай грызьні, піша кіраўнік Беларускага ліцэю Уладзімер Колас. **Старонка 4.**

## Гэта кіно пра нас

Нёман падмывае хаты, а іх старыя насельнікі штогод перапраўляюць кароў на выспу. Былы клоўн, выжыўшы пасьля аварыі, выбівае на камянях крыжы — як пакліканьне. У напаўпустой вёсцы жыве маладая сям'я зь дзіцём. Рэжысэр Віктар Асьлюк за фільм «Мы жывём у краі» быў намінаваны на прыз Эўрапейскае кінаакадэміі. **Гутарку з майстрам чытайце ў наступным нумары «НН».**

## Тыдзень без чужога слова

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова. Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапіку «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Падпіску на сакавік прымаюць да 15 лютага. Адкрытая падпіска таксама на другі квартал.

ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

Беларускія тэнісісты ў чарговы раз нагадалі нам усім, што воля гарады бярэ. Беларускія ліцэісты працягваюць вучыцца самастойна, затое па-беларуску. Ужо няма сумневаў, што гэты навучальны год яны давучацца. Будучыня ж Ліцэю залежыць ад таго, ці ўдасца ў чэрвені нармальна зрабіць новы, чарговы набор. Ліцэй патрабуе сталай увагі і падтрымкі незалежнага грамадзтва.

У Расеі зарэгістраваныя сем кандыдатаў у прэзыдэнты. Дзіўная кампанія ідзе! Усе б'юць сябе ў грудзі як сапраўдныя апазыцыянэры, але пры гэтым ніводзін не наважваецца заявіць: Пуцін ня здольны даць рады тэрору, ён загруз у Чачэніі, ён вінаваты ў разьвязваньні вайны, якую трэба неадкладна спыніць, — хоць такіх думак трымаецца значная частка выбарцаў. Пра тое, чаму такая безьветранасьць у палітычнай атмасфэры, трохі гавораць зьвесткі пра даходы расейскага палітычнага істэблішмэнту на старонцы 7.

Прадстаўнікі намэнклятуры, што перайшла ў апазыцыю, утварылі новы грамадзкі рух. Ён называецца «За перамены». Новага ў ім тое, што 147 заснавальнікаў руху адразу ж вылучылі свайго кандыдата на выбары-2006 — няўдачніка кампаніі'2001 Аляксандра Ярашука. Сыходзіць з «Маладога фронту» Севярынец — пра гэта на старонцы 5.

Сярод нашаніўскіх матэрыялаў мінулага нумару палеміку выклікала думка ці, дакладней, гіпотэза, пункцірам абазначаная ў калёнцы Вацлава Заякоця. Вось яна: грамадзкім дзеячам варта цалкам адмовіцца ад палітычнай дзейнасьці дзеля захаваньня магчымасьці культурнай, арганічнай працы, раз ужо аўтарытарная ўлада дазваляе рабіць усё, акрамя таго, што не кранае самой улады наўпрост. Што й казаць, паражэнскае меркаваньне, нешта накшталт філязофіі «Тыгодніка Паўшэхнага» і Кола «Знак» у часы Гамулкі. Пачытайце, што адказвае Заякоцю Ўладзімер Колас.

**Андрэй Дынько**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Галіна Жураўкова

**Мэнэджэрка лукашэнкаўскае бізнэс-імпэрыі трапіла ў няласку. Паводле інфармацыі «Інтэрфаксу», зь вечару аўторка і яна, і яе сын Сяргей арыштаваныя па крымінальнай справе аб злоўжываньнях у Кіраўніцтве справаў прэзыдэнта. Яе папярэднік на пасадзе, Іван Ціцянкоў, таксама не апраўдаў даверу і пакінуў «ЗАТ» прэзыдэнтуры, якое займаецца імпартам нафты, рыбы, цукру, распараджаецца офісамі Менску і санаторыямі Нарачы.**

# Заява Рады БНР

**Менскія ўлады пазбаўляюць Таварыства беларускай мовы (ТБМ) памяшканьня на вуліцы Румянцава.** Дагэтуль няясна, што за плошчы будуць прапанаваныя моваабаронцам узамен. На трывожную сытуацыю адгукнулася Рада БНР.

«Пагроза, якая цяпер паўстала перад ТБМ, павінна быць у цэнтры грамадзкай ўвагі. Народ, пазбаўлены мовы, робіцца нямым, — гаворыцца ў Заяве Рады. — Гэта павінны разумець і тыя палітычныя лідэры ў Беларусі, якія дэкляруюць прыхільнасьць прынцыпам дэмакратыі і рынку. Безь беларускай мовы немагчымае нацыянальнае Адраджэньне, а без Адраджэньня ніякія рынкавыя рэформы не прынясуць дабрабыту беларускаму народу».

Рада БНР заклікала ўсе партыі і арганізацыі ў Беларусі, якія стаяць на пазыцыях Незалежнасьці, падтрымаць ТБМ у ягоным змаганьні за адраджэньне беларускай мовы.

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Расшыфроўка цялесных мэсыджаў

**Тэнісісты за пару дзён ператварыліся ў агульнанацыянальны кіч.**

Калі заўтра такі непрэстыжны занятак, як збор кардону, атрымае статус спартовай дысцыпліны і наш бомж зробіцца прызёрам сусьветнага турніру, ягоныя густы, хламіды і нават пах стануць прадметам жорсткай спрэчкі паміж аматарамі дзьвюх дактрынаў беларускага спорту. Афіцыйная прапануе разглядаць дасягненьні спартоўцаў як эманацыю посьпехаў лукашэнкаўскага курсу. Апазыцыйная — як бум нацыянальных сантымэнтаў.

У нядзелю БТ угледзела ў пераможнай позе Ваўчкова падзяку кіраўніку дзяржавы і акт «расейска-беларускага» пхайпхай, радыё «Свабода» — прарыў нацыяналістычнага лібіда праз «зьвыш-Яно» каляніяльнай сьвядомасьці. Naviny.by пішуць, што дэмакраты пакінулі палітычны корт, аднак асабіста я не сустракаў ніводнага, хто б казаў: «Чуў, чувак, як нашы слаўна сябравалі з расейскімі тэнісістамі на былы ўік-энд?» Увесь сьвет непаліткарэктна кажа: «Нашы апусцілі мас…лёў».

Магчымай рэакцыяй уладаў можа быць выпуск спэцыяльнага мэтадычнага даведніка «Як перамагаць расейскіх спартоўцаў». Футбалістам будзе прадпісана, забіўшы гол братам па славянскай расе, ня бухацца ад шчасьця на зямлю, равучы: «Ну што, адс...аў?!» Наадварот, усёй камандай складаць зь целаў надпіс на полі: «Няхай жыве расейска-беларускі саюз і газ па цэнах пятага ўнутранага поясу!»

Нацыяналісты ж могуць і далей шукаць у паводзінах Мірнага й Ваўчкова мікраманіфэстацыі апазыцыйнасьці. Можна скласьці зборнік для расшыфроўкі цялесных мэсыджаў Мірнага. Напрыклад, плявок можа значыць «Пляваць хачу на Луку», а адкрытая пяцярня — заклік: «Галасуй за кандыдатаў Народнай кааліцыі 5+».

Чыстымі пераможцамі ў барацьбе за сымбалічны капітал перамогі аказаліся не палітыкі, а панкі. Яны даўно пакутавалі на дэфіцыт аб'ектаў для эпатажу. Тэнісісты за пару дзён ператварыліся ў агульнанацыянальны кіч. Скандальныя імправізацыі на тэму зробяць нашу багему абсалютнымі парыямі. Чакаю ад Жыбуля паэму «Я люблю глядзець, як кульгае Ваўчкоў», а ад Вішнёва — палатно «Максім Мірны даведваецца, што ён падхапіў ВІЧ».

За справу.

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ



# Чэрчыль з 125-й кватэры

**Збудаваць 200-мэтровы дом пад Менскам каштуе столькі ж, колькі набыць 100-мэтровую кватэру ў панэльным доме ў Малінаўцы.**

Пры гэтым кватэры працягваюць даражэць: за кошт самай занядбанай сталічнай аднапакаёўкі можна прыдбаць дамок з выгодамі ў Калодзішчах. Не ратуе, а толькі ўзмацняе гэты парадокс тое, што будматэрыялы за апошнія гады істотна патаньнелі, а зямельныя пляцоўкі нядаўна знoў дазволілі прыватызаваць, што абумовіла на гэтым рынку дадатковае прапанаваньне. Чаму нашыя людзі не будуюць сядзібаў, а лезуць у шматпавярховыя клеткі? Чаму ў Вільні й нават Празе фармат «мурашнікаў» ужо мала каго цікавіць і цана квадратнага мэтра ўсяго, што ў спальных раёнах, стала ніжэйшая за менскую?

Глядзіш, бывае, чалавек з дастаткам, а туды ж: селіцца на 13-м паверсе «элітнай забудовы», убухае мільёны ў дэкор, але слухае празь сьцены суседзяў, нюхае сьмецьцеправод, сарамліва азіраецца, калі ягоны цуцык кладзе кучу на газон у двары...

Няхай даруюць мне жыхары густанаселеных каробак, але ні дэ Голі, ні Лукашэнкі ў такіх месцах не ўзгадуюцца. Цяжкавата, напэўна, знайсьці нейкага лідэра, у якога дзяцінства прайшло па адрасе зь лічбамі праз дроб. Што ні міністар, што ні дырэктар заводу — усе зь вёскі ці з прыватнага сэктару.

Бог стварыў чалавека свабодным і наказваў гэтага трымацца. Не ступіўшы гаспадаром па *сваёй тэрыторыі*, грамадзе й дзяржаве рады не дасі.

А што Чэрчыль? Дык тут такіх няма.

**Вацлаў Заякоць**

Меркаваньні аглядальнікаў могуць не супадаць з пазыцыяй рэдакцыі.

## Сход інтэлігенцыі

**Другі ўсебеларускі сход інтэлігенцыі адбудзецца 3 красавіка.** Такое рашэньне прыняла Рада беларускай інтэлігенцыі. Галоўным пытаньнем сходу стане ўдзел інтэлігенцыі ў восеньскіх выбарах і ўтварэньне камітэту «За сумленныя выбары».

**МБ**

ДАСЛОЎНА

## Газ нас ня возьме

**«Беларусі не пагражае крызыс, калі Расея павысіць цэны на газ», — мяркуе кіраўнік місіі Міжнароднага валютнага фонду Томас Рычардсан.** «Для плацежнага балянсу краіны эфэкт не перавысіць 1—2%. Краіне, у якой каля 50% ВУП канцэнтруецца ў дзяржбюджэце, будзе нескладана знайсьці рэсурсы, каб згладзіць гэты эфэкт», — сказаў ён. Наадварот, «такое павышэньне вымусіць прадпрыемствы працаваць больш эфэктыўна».

БЕЗ ГЛУЗДОЎ

## Можа, і з «варанкамі»?

**Галоўны архітэктар інстытуту «Менскпраект» Міхаіл Гаўхфельд і менскія ўлады задумалі стылізаваць парк Чалюскінцаў пад 1930-я.** Мусіць, каб абноўленаму сквэру на вул.Леніна не было сумна. У парку зьвіецца адпаведная агароджа, паркавыя скульптуры — ледакол на крызе, самалёт той эпохі. Нават «ракушка» будзе перназваная ў «Танцпляцоўку «Чкалаў». Сёньня парк выглядае, мякка кажучы, непрэзэнтабэльна. Але рамантызацыя сталінскай эпохі тут будзе глядзецца асабліва недарэчна, бо парк быў адным з «расстрэльных» лесамасіваў у тых самых 30-х. Няма сумневу, у выніку шырокага абмеркаваньня (а не келейнага, якое практыкавалі ў часы Чадовіча) удалося б знайсьці лепшы варыянт абнаўленьня.

ЗДАРОЎЕ

## Алергія — хвароба стагодзьдзя

**Пад 2015 год кожны другі эўрапеец будзе пакутаваць ад алергічных захворваньняў.** Хваробай стагодзьдзя ў Эўропе стае ня СНІД. Да такое высновы прыйшлі навукоўцы з 25 навукова-дасьледчых цэнтраў. Кіраўнік навуковага праекту, дэкан мэдычнага факультэту ўнівэрсытэту ў Генце (Бэльгія) Поль Ван Каўвэнбэргэ даў зьвесткі: 30 гадоў таму каля трацiны выпадкаў астмы былі выкліканыя алергіяй, цяпер жа гэты паказчык дасягнуў 80%. Прычым алергія аднолькава кранае людзей на ўсім кантынэнце. Самымі схільнымі да алергіі ў Эўропе аказаліся дзеці ў Вялікай Брытаніі, другое месца займае Ірляндыя, пасьля — Мальта й Фінляндыя. Горшыя паказчыкі маюць у сьвеце толькі Аўстралія і Новая Зэляндыя. Чакаецца, што Эўракамісія вылучыць на барацьбу з алергіяй 14,4 млн эўра.

## Трашчанок размнажаецца

**Скандальны падручнік «Гісторыя Беларусі. Дакастрычніцкі пэрыяд» Якава Трашчанка неўзабаве будзе перавыдадзены.** Падрыхтоўкай да друку займаецца Выдавецкі цэнтар БДУ. Ад леташняга выданьня («НН», №28'2003) сёлетняя «Гісторыя» розьніцца ў лепшы бок наяўнасьцю рэдактара й карэктара. Аўтар перапрацоўкай тэксту не займаўся. Настаўнік Лукашэнкі Якаў Трашчанок вяртае ў навуку тэзысы нават не савецкіх часоў, а «заходнерусізму» XIX ст.

**Адам Воршыч**

# Выйшаў зрабіў

У пятніцу, трапіўшы ў бальніцу, Уладзімер прымаў спачувальныя тэлефанаваньні ад знаёмых і нават ня думаў, што хутка давядзецца зноў брацьу рукі ракетку. Дактары жартавалі: вось мы зараз пачаруем — і ў нядзелю будзеш бегаць па корце. Дажартаваліся. Супраць Южнага ў нядзелю Ваўчкоў выходзіў з адзінай думкай: прынамсі, выйсьці, а там — як удасца. Само зьяўленьне яго на корце стала перамогай.

### Цуд, створаны Пашуком

Траўматоляг Павал Пашук, загадчык аддзяленьня 6-й клінічнай бальніцы, які накладаў павязку Ваўчкову перад матчам, спачатку паспрабаваў яе на сабе. Спадар Павал рабіў апэрацыю Ўладзімеру паўгоду таму, і з тае пары яны моцна сябруюць. Ваўчкоў нават запрасіў свайго доктара на Кубак Дэвіса, ня ведаючы яшчэ, што спатрэбіцца дапамога... Пасьля фатальнае пятніцы Пашук не адыходзіў ад Уладзімера. Без Пашука невядома, ці ўдалося б падняць Ваўчкова.

Месца для подзьвігу заўсёды ёсьць там, дзе ня створана належных умоваў для працы. Беларускія тэнісісты ня маюць нармальных кортаў, не падрыхтавана добрай замены для складу зборнай. Хлопцы, якія падавалі надзеі, цяпер жывуць за мяжой і гуляюць у непрафэсійных унівэрсытэцкіх зборных.

Уладзімер лічыць сваім абавязкам працаваць з маладым пакаленьнем, перадаваць ім досьвед, прызнаўся ён на прэсавай канфэрэнцыі ў аўторак. Таго самага чакае і ад Макса Мірнага. Ваўчкоў тым больш разумее патрэбу такога выхаваньня, што сам з шаснаццаці гадоў займаўся бяз трэнэра. Завочна трэніруецца, кансультуючыся найчасьцей праз тэлефон. Сур'ёзную падрыхтоўку ён атрымліваў з 13 да 15 гадоў у Амэрыцы: Цяцерын паехаў туды працаваць і ўзяў Уладзімера з сабой. Але Ваўчкоў лічыць, што беларуская тэнісная база павінна быць у Менску.

Расейцы ня выйшлі на выніковую прэс-канфэрэнцыю і толькі ў панядзелак па тэлефоне павіншавалі беларускую каманду зь перамогай. А некалі, у 2000-м, Ваўчкоў выступаў на Ўімблдоне ў форме Сафіна... І сэнсацыйна добра выступіў. Нават Аляксандар Лукашэнка віншаваў яго праз пасла Вялікай Брытаніі. Прасіў перадаць, што асабіста прыедзе на гульню, калі Ваўчкоў выйдзе ў фінал. Тады Ўладзімер ня даў яму такой магчымасьці. Затое цяпер была магчымасьць засьвяціцца перад фотакамэрамі разам з героямі й нават узнагародзіць іх за перамогу над Расеяй. Тэнісісты напэўна былі б больш удзячныя, калі б якасьць корту была лепшая. Тое, што пабаяліся выказаць беларусы, адкрыта вымавіў Сафін: пакрыцьцё траўманебясьпечнае, занадта сьлізкае. Трыбуны праверылі на моц, а падлогу не дадумаліся...

**Як проста і як цяжка стаць нацыянальным героем! Выхад траўмаванага Ваўчкова на корт у Кубку Дэвіса застанецца ў гісторыі спорту нароўні з учынкам Аляксандра Мядзьведзя, што падчас двубою на вачох у суперніка ўправіў зламаны палец, альбо перамогай Ленса Армстранга ў «Тур дэ Франс», пасьля таго як ён вылечыўся ад раку.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

«З пункту гледжаньня паліттэхналёгіі пад купалам манэжу ўсё рабілася пісьменна», — іранізуюць naviny.by з нагоды тэрміновага прыезду туды Лукашэнкі. Палітоляг Віталь Сіліцкі жартам раіць кіраўнікам апазыцыі, што з Рыгі перамясьціліся ў Вашынгтон, «масава купляць білеты на чвэрцьфінал Кубку Дэвіса». «Частка айчынных апазыцыянэраў пакутуе комплексам савецкага дысыдэнтва, — наракае ён. — Бачыць сытуацыю выключна ў духу тэзы «спорт — зброя таталітарызму» — значыць бачыць ня ўсю праўду». Сп.Сіліцкаму можна запярэчыць, што рэдка маем у нашай частцы сьвету прыклады (прыгадваецца толькі латвійская баскетбалістка Сямёнава), каб вядомы спартовец далучыўся да дэмакратычнага нацыянальнага руху. Ці таму, што спартоўцы някепска зарабляюць, ці таму, што яны «грамадзяне сьвету», ці праз адсутнасьць палітычнага мысьленьня. Затое спартсмэны — сапраўдныя каталізатары нацыянальнага пачуцьця.

### Тэнісіста ў прэзыдэнты

Тэнісісты ўраз сталі надзвычай папулярнымі ў краіне. Форум open.by, у якім удзельнічаў Мірны, не вытрымліваў колькасьці наведнікаў. Макс адказаў на пытаньне, ці пагадзіўся б ён стаць прэзыдэнтам Беларусі: «Не. Надта я люблю тэніс і далёкі ад палітыкі». Затое ён марыць пра сцэнічную кар'еру: «Са мной займаюцца такія прафэсіяналы, як Анатоль Ярмоленка зь «Сяброў», Ільля Пеўзнэр, тэнар Опэры, і Ксеня з татам. Сёе-тое ўжо запісалі, але пакуль усё сырое». А таксама вучыцца міжнароднаму праву ў БДУ: «Мы мусова спаткаемся з усімі студэнтамі-міжнароднікамі і іншымі ды пагаворым за жыцьцё».

Пытаньне ад навучэнкі Коласаўскага ліцэю пра лёс установы Мірны праігнараваў. Увогуле, Мірны, які ад 13 гадоў жыў у Амэрыцы, адказваў на пытаньні вельмі па-амэрыканску. Гэты цыбаты дзяцюк, які за сваю кар'еру зарабіў ужо 4 мільёны даляраў, бясконца дзякаваў усім-усім — ад мэра Паўлава да прыбіральшчыц — за клопат пра тэніс.

З кожнай такой перамогай Беларусь перажывае ўсплёск нацыяналістычнага basic instinct. О так, «мы» паказалі «ім», што й мы ня зломкі. Падобна чэхі ў 1969-м цешыліся хакейнай перамозе. У гэтым пачуцьці гонару за сваю нацыю няма нічога кепскага. Аднак і складаным яно не назавеш. Стваральным яно робіцца, толькі калі браць з Ваўчкова прыклад па-сапраўднаму — вучыцца пераўзыходзіць сябе. Што цяжэй, чым гукаць: «Як мы іх надралі!»

**Веранiка Дзядок**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Музы: Ксеня Мірная (зьлева) і Вольга Ваўчкова**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Сіла волі

Галоўным, дзякуючы чаму беларусы зламалі расейцаў у нядзелю на шляху да тэніснага Кубку Дэвіса, безумоўна, была воля. Высокае прафэсійнае майстэрства, хітрая тактыка, нечаканыя захады трэнэрскага складу, шалёная падтрымка заўзятараў, якія запоўнілі трыбуны Футбольнага манэжу, былі толькі тлом, які адцяняў непахісную волю да перамогі беларускай каманды. Настрой, зь якім беларусы выйшлі на гульню, можна было памацаць рукамі. Перад тэлевізарам спыняліся нават людзі, далёкія ад тэнісу, такая адтуль праменіла напруга.

Пасьля траўмы Ваўчкова, калі, паводле ўсіх разьлікаў, на агульны посьпех у беларусаў не было шанцаў, уразіў твар Мірнага. Поўная канцэнтрацыя і засяроджанасьць. Калі Сафін, у лютасьці пасьля прайгранага мяча, зламаў ракетку, стала ясна: воля Мірнага перамагае. Ён упарта цягнуў, здавалася б, прайграныя геймы, дацiскаў па драбніцах у самых напружаных момантах, і ўрэшце Сафін здаўся. Гульня Мірнага была перадумовай цуду, які мусіў адбыцца. Зрэшты, любы цуд мае свае складовыя часткі.

Магчыма, не атрымаў бы Ваўчкоў траўму, беларусы справіліся б з задачай раней, але сустрэча згубіла б у драматызьме. Так ці інакш, Беларусь займела новых герояў.

Расейскі герой фіналу Кубку Дэвіса двухгадовай даўніны Міхаіл Южны быў папросту зьмяты Ўладыятарам (такая мянушка ў Ваўчкова). Зьмяты, перадусім, маральна. Вельмі складана супрацьстаяць суперніку, які знайшоў сілы перамагчы сябе ў цябе на вачох.

Выхад Ваўчкова на корт быў зьвяй аднае прыроды з учынкам Аляксандра Мядзьведзя, што падчас двубою на вачох у суперніка ўправіў зламаны палец, альбо перамогай у «Тур дэ Франс» амэрыканскага гоншчыка Ленса Армстранга, пасьля таго як ён вылечыўся ад раку. Усе гэтыя выпадкі характэрныя найвышэйшай канцэнтрацыяй чалавечае волі.

Такімі яскравымі праявамі волі нельга не захапляцца, бо гэта ўнівэрсальны, «чысты прадукт» чалавечых высілкаў. Тут нічога нікому ня трэба тлумачыць.

**Алег Дашкевіч**

# Брэх ягнятаў



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Што, каб ягнё, назіраючы за тым, як воўк пажырае ягоных суродзічаў, пачало бляяць у гонар гэтага ваўка хвалебныя оды ці брахаць на сваіх жа суродзічаў?

Як вядома, у жывёл пэўныя спосабы выжываньня закладзеныя ў генную сыстэму і спрацоўваюць аднолькава для цэлага віду. Напрыклад, скунсы выпускаюць зь сябе сьмярдзючую вадкасьць, каб яе пах адбіў у драпежніка ахвоту іх есьці, хамэлеоны мяняюць афарбоўку, каб зьліцца з навакольным асяродзьдзем. А вось авечкі ці іншыя парнакапытныя моўчкі жуюць сваю жвачку, пакорліва чакаючы, пакуль надыдзе іхняя чарга быць зжортымі.

Дзеля характарыстыкі і абазначэньня таго ці іншага спосабу паводзінаў сярод людзей прынята ўжываць параўнаньні з пэўнай пародай насякомых ці жывёл, для якіх дадзены спосаб зьяўляецца вызначальным. У мастацтве, як вядома, такое параўнаньне называецца алегорыяй і шырока выкарыстоўваецца ў самых розных жанрах. Напрыклад, уласьцівая жвачным парнакапытным схільнасьць пакорліва маўчаць, калі над табой і над супольнасьцю, у якой ты жывеш, навісае небясьпека, адлюстраваная ў назьве навязанай нам усім у якасьці культавай садамазахісцкай галівудзкай кінастужцы, якая так і завецца: «Маўчаньне ягнятаў».

Але часам людзі вынаходзяць у справе самазахаваньня нешта прынцыпова новае, абсалютна немагчымае і фантастычнае ў сьвеце жывёл. Што б мы сказалі, напрыклад, каб ягнё, назіраючы за тым, як воўк пажырае ягоных суродзічаў, раптам пачало бляяць у гонар гэтага ваўка хвалебныя оды ці брахаць, але не на ваўка, а на сваіх жа суродзічаў, калі тыя спрабуюць аб'яднацца і супрацьстаяць нападу? А сярод людзей такое здараецца.

Вось і цяпер сярод нас вызначаюцца ягняткі, якія пачынаюць брахаць на тых, хто жадае заставацца людзьмі і супрацьстаяць чарговым спробамператварыць нас усіх у статак.

Правяла летась інтэлігенцыя Ўсебеларускі сход, на якім адкрытым тэкстам выказала сваё стаўленьне да таго, што адбываецца ў краіне, — «Народная воля» адрэагавала на яго непрыстойным гукам з вуснаў нейкага ананіма-«крыжака». Вырашылі навучэнцы і пэдагогі Беларускага ліцэю трымацца разам і супрацьстаяць зьнішчэньню адзінай элітарнай беларускай навучальнай установы — і дачакаліся брэху, прычым таксама не ад абы-каго, а ад «Нашай Нівы», якую дагэтуль лічылі сваім галоўным абаронцам.

Ніхто ня супраць разумнай аргумэнтаванай крытыкі. Але ёсьць крытыка і ёсьць такая зьява, як старанна праліччаны паклёп, на што значна больш падобны допіс пад назвай «Дык не падпісвайся», апублікаваны ў мінулым нумары «НН». Згодна з Вацлавам Заякоцем, барацьба Таварыства беларускай мовы за беларускасьць, як і барацьба калектыву Ліцэю за сваю ўстанову і за беларускамоўную адукацыю, ёсьць усяго толькі кампаніяй Коласа і Трусава за ўласны палітычны капітал. Не зьбіраюся губляць часу на абвяржэньне такога абвінавачаньня. Каму незразумела, якія выгады можна сёньня набыць за такі «капітал», няхай спытаюць у Ганчара ці Захаранкі. Аналягічны сэнс маюць і знаёмыя заклікі «суаднасіць імаверную рызыку і магчымы плён». Цяперашнія падзеі зь дзьвюма іншымі навучальнымі ўстановамі, якія, як і наш Ліцэй, маюць у сваёй назве слова «гуманітарны» (Міжнародны гуманітарны інстытут і Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт), у чарговы раз хрэстаматыйна дэманструюць, які плён маюць спробы адседзецца моўчкі і паасобку, калі «мочаць» тваіх калег. «Узяцца за пяро» прымусіла зусім іншае. Безумоўна, зьмяніць сытуацыю здраньцвеньня, апатыі і пакорлівасьці, у якую ўсё больш пагружаецца нашае грамадзтва, можа толькі актыўная грамадзянская пазыцыя, толькі салідарнасьць, толькі супольныя дзеяньні ў адказ на свавольствы і самадурства рэжыму. І як ніколі гэта актуальна цяпер, сёлета, калі нам даецца, магчыма, апошні шанец зьмяніць гэтую сытуацыю законным цывілізаваным шляхам — праз выбары ў парлямэнт.

Зрабіць гэта будзе немагчыма, калі мы і надалей будзем лічыць, што галоўнае — гэта «сумленна рабіць сваю справу і ня лезьці ў палітыку». Каму яшчэ незразумела, да чаго мы дойдзем, калі дазволім і надалей вырашаць свой лёс клану чыноўнай намэнклятуры? Калі мы зноў дазволім злачынныя махінацыі і махлярствы падчас рэгістрацыі кандыдатаў, правядзеньня выбараў і падліку галасоў? Калі ня вылучацца кандыдатамі ў дэпутаты і ня будуць абранымі ў парлямэнт вядомыя вучоныя, пэдагогі, дзеячы культуры, знаныя і паважаныя ў сваёй мясцовасьці людзі? Калі не згуртуем дзеля дасягненьня гэтых мэтаў палітычных лідэраў і ўсё нашае грамадзтва?

Менавіта дзеля гэтага прыкладаюць сёньня намаганьні і Трусаў, і Колас, і ўсе, хто разумее і суадносіць рызыку маладушнага бязьдзеяньня ды плён сумленнай і прынцыповай грамадзянскай пазыцыі для ТБМ, для Беларускага ліцэю і для ўсяго грамадзтва.

Ніколі не было ілюзій наконт таго, як будзе рэагаваць на нашыя справы чыноўная «вэртыкаль» і якіх захадаў можна чакаць у адказ. Але зьнішчэньнем Ліцэю і новымі наступамі на ТБМ гэтае спадарства зноў паставіла сябе ў вельмі незайздроснае становішча. Што можа быць больш нізкім і ганебным, чым змаганьне зь дзецьмі, якія жадаюць у сваёй краіне вучыцца на мове свайго народу, і з самой гэтай мовай?

Далёка ня першы раз ня толькі «НН», але і шмат якія іншыя нашыя выданьні, якія маюць статус дэмакратычных і незалежных, бянтэжаць нас несправядлівымі і на першы погляд незразумелымі нападамі на сваіх жа паплечнікаў. Тлумачэньні кшталту своеасаблівага разуменьня «плюралізму і свабоды слова» тут не падыходзяць. Газэта, тым больш такога напрамку, як «НН», — гэта ня плот, на якім хто хоча можа пісаць што хоча. Тое, што «НН» палічыла магчымым надрукаваць такі допіс, сьведчыць пра наяўнасьць калі не пазыцыі, то пэўнай тэндэнцыі.

Калі такая тэндэнцыя захаваецца, ёсьць рызыка назаўсёды закансэрваваць сярод нас стан узаемнага недаверу і міжусобнай грызьні.

**Уладзімер Колас**

Сяргей Харэўскі

# Па плыні

Э С Э



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

І які ж беларус ня любіць плысьці паволі? Ці ж ягонай душы, што імкнецца сузіральна супыніцца, засамоціцца, сказаць часам: «Неяк жа будзе...», — ці ж ягонай душы не любіць гэтага? Як не любіць плысьці, калі ў тым чуецца нешта трымцьліва-летуценнае?

Здаецца, узяла ў абдоймы цябе нязнаная сіла, укруціла, уклеіла ў вір, да сябе, і плывеш сабе, і ўсё плыве: сплываюць гады, праплываюць знаёмыя твары, плыве насустрач вербалоз із шыхтамі алешынаў ды адзінокімі ясенямі. А навокал ціша ватовая ды тумановая, ані брэху сабачага, ані вуркатаньня сэпаратара малочнага. Цячэ сабе плынь і зносіць у немаведамую далечыню, што нікне за выгбаю берагоў, і нешта вусьцішнае тоіцца ў гэтым пакручастым зьніканьні, дзе зь вільготнай смугі шарай гадзінаю не пасьпявае акрэсьліцца хоць якая рэч, — адно маціцовае неба над галавою, ды бязважкія расплеценыя хмарыны, ды німб ад кволага маладзіка адныя здаюцца нязрушнымі...

Беларусы пакрысе, але няўхільна пачынаюць любіць сваё йснаваньне ў незалежнай сваёй краіне. З тых самых прычынаў, што змушалі іх любіць сваё наканаванае йснаваньне ў іншых дзяржавах. Бо беларус любіць усё адстаялае, звычнае і павольнае. Зноўку рака зрабіла свой паварот, і ўсё, што было за плячыма толькі во, зьнікла й растала ў мройнай імжы. Нарэшце ён, народ, прывык жыць у сваёй Беларусі. А што прынясе якая тая інтэграцыя, расейская ці эўрапейская, ён ня ведае, ня можа пасьпець пралічыць, дый ня хоча. Няма вайны — і ўжо добра. Нейкія грошы плацяць — і то радасьць. Балазе, і на чэргі забыліся. Беларус плаўна прывыкае да ўласных грошай, як да чужых, і да чужых прызвычайваецца, як да сваіх, таксама.

Вой, плынь! Струмень няўлоўны твой, плынь, хто выдумаў цябе? Чаму ня б'еш ты мэтраномам хваляў у трывалыя берагі лёгікі, чаму ня б'ешся ты сьпеўным рэхам між горных цясьнінаў вобразаў? Відаць, ты, плынь, нарадзілася ў зямлі народу няпэўнага, у тым краі, дзе не сьмяюцца ўголас ды распавядаюць казкі пра малога Піліпка, які ведзьму ўчаставаў дачкою ейнай, у печы зваранай. Не жартуе беларус рахманы й чужога сьмеху ня любіць, касавурыцца — ці не зь яго сьмяюцца? Хоць што-небудзь чорнае-зачорнае распавесьці можа. Хіба каб навокал не было гэтак пустэльна-тумановаглуха? І, як спрадвеку, усё болей пра чужых, хоць пра жыдоў, хоць пра эстонцаў, абы не пра сябе. Абы не спыняцца, ня ўдумвацца, не вызначаць, куды нясе яго плыня... Ані зьнічкі ўсьмешкі ў тварах, якія пахмура ўтаропіліся ў дрыготкае люстра тэлеэкранаў, ажно датуль, пакуль не замружыцца яно табе вочы.

Закруціць, бывае, глыбокая плынь у вір сьвятаў, што няўмела й няўцямна адзначае Беларусь, зьнясіліць ды вынесе на плыткую празрыстую ваду ніштоства і панясе, панясе да наступнага павароту перадсьвяточных амбарасаў. Ажно пакуль далікатная лілея чэпкім бясконцым сваім сьцеблюком ня спыніць цябе. І адпачнеш у пене лілейнай.

Адно пасьпявай глядзець па баках, мінае ўсё — з дрыготкімі пругкімі жыламі вербы, бухматымі кручанымі лапамі сосны. Мінаюць высачэзныя, адно шапку трымай, стромыя адхоны, магілы карэньня. Здаецца, ускараскайся ўгару — убачыш, адчуеш, зразумееш сэнс шляху плыннага свайго. Ды не, убачыць можна задужа. Убачыш далёка й тое, адкуль прыплыў, што пакінуў за плячыма. А так, зьвіліся ў вадзе тугім суплётам косы сутраўя, ляглі па плыні й панесьлі цябе зноў у нязьведаныя тумановыя блізкагляды. Засталіся там, за плячыма, лёсы й досьведы, чыесьці малыя драмы й малыя шчасьці. Не пасьпяваюць астываць магілы, а ўжо й зьнікаюць за выкрутам плыні... За адвернутымі сьпінамі крыжы, крыжы, крыжы... І пра жывых забываецца хутчэй, чым пра мёртвых. Панясе, панясе, і ўжо не адрозьніш катаў ад ахвяраў, пэрсонаў ад пэрсанажаў. А і памрэ прарок, а ўсё не палюбяць.

І плыве, плыве цэлы край, зьняможаны й няўпэўнены, зьняверваны й недарэчны нат для самога сябе, плыве абы-як, як прыладзіўся хто, у суцэльнай маўклівай чарадзе, дзе кожны сам. І выгнулася гэтая чарада, разьвяглася, расьцягнулася, разьлезлася, бы слотнае шумавіньне, што ўтворанае немаведама з чаго й немаведама куды зьнікне... Адно, збрыдзіўшыся, падкіне яго стары трывушчы корч, што хоць памятае, чым ён быў калісьці. І панесьліся, панесьліся, панесьліся хлудлівыя шумавіны, разьляцеліся на мільён беспатрэбных клетак. А ўжо за чарговым скрутам млявае плыні зноў зьбівае іх у камякі вада.

Абурыцца беларус, што ўсё вакол не ягонае, нат словаў ня знойдзе ад пачуцьця, што перапоўніць часам яго, бо й словаў уласных ня мае. А калі й вынайдзе, вымысьліць, выпакутуе слова якое сваё, адчуе сябе самотным. Ня знойдзе сілаў азвацца ім, словам сваім, збаіцца, зганорыцца, зьбянтэжыцца. І зноў паплыве сабе паволі за далягляд, за якім чуваць адно чыйсьці адзінотны, ледзьве чутны плёхкат, цурчэньне чыйгосьці недаказанага нікім. А бывае, як хочацца беларусу паразважаць, памянціць пра родную мову, у скрусе абхапіць далонямі скроні... Ды не, ня будзе ён каго змушаць. Ні дзецям, ні жанцэ сваёй пра мары свае не раскажа.

Куды ж плывеш ты, Беларусь, да якога акіяну-мора, да свайго дзе Дунаю? Усё мінае міма цябе, неаплаканыя радасьці й горы, сьмяцьцё са скарбамі незьлічонымі, усё адстае й застаецца ззаду. Спыніцца чужаніца, уражаны павольным тваім бязмэтным плыцьцём: што б магло азначаць гэтае рушаньне, што наводзіць роспачную скруху? Беларусь, куды нясуць цябе бруі твае? Дай адказ. Няма адказу.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зь юніёраў у дарослую лігу

## пераходзіць Севярынец

Як і для артыста, для палітыка самае складанае — сысьці ў час. З гэтым не заўжды ўгадваюць нават такія зубры, як Гельмут Коль. Севярынец пакідае пасаду старшыні «Маладога фронту», каб заняцца яднаньнем нацыянальных сілаў на хрысьціянскай аснове.

Пытаньне лідэрства ў МФ абмяркоўвала Цэнтральная Рада, якая зьбіралася ў Менску ў нядзелю. Павал Севярынец паведаміў журналістам, што яму ўжо 27 гадоў, зь якіх сем ён старшыня МФ. Між тым у арганізацыі падрасла цэлая група маладых лідэраў, вартых кіраўнічай пасады. Асноўных прэтэндэнтаў два: кіраўнік Менскай гарадзкой арганізацыі Зьміцер Дашкевіч і міжнародны каардынатар МФ Сяржук Лісічонак. Яны будуць на зьмену кіраваць маладафронтаўцамі да травеньскага Сойму. Фармальна старшынём арганізацыі застаецца Севярынец.

На трох апошніх Соймах незарэгістраванага МФ Севярынцу спрабавалі стварыць канкурэнцыю Яўген Скочка, Аляксей Шыдлоўскі і Вадзім Саранчукоў. Але ўсе яны прайгралі. Такім чынам, маладафронтаўскі лідэр сыходзіць непераможаным. Свой учынак Павал лічыць «даволі рэдкім выпадкам у беларускай палітыцы». Ён перакананы, што яго добраахвотны сыход павінен стаць сыгналам «старэйшым таварышам», многія зь якіх ужо «маральна састарэлі». Севярынец кажа, што барацьба за пасаду старшыні МФ будзе «спаборніцтвам моцных лідэраў». Дашкевіча ён рэкамэндуе як «легенду «Маладога фронту», арганізатара вулічных акцыяў. А Лісічонак, паводле Севярынца, «адзін з самых пэрспэктыўных міжнароднікаў Беларусі». Ужо існуе дамоўленасьць, што пераможца барацьбы за пасаду старшыні прызначыць намесьнікам свайго апанэнта.

Севярынец сыходзіць з МФ, але не з палітыкі. Сёлета ён будзе каардынаваць працу блёку «Маладая Беларусь», а пасьля выбараў пляную заняцца «новым палітычным праектам». Што гэта за праект, Севярынец не ўдакладніў, толькі зазначыў: «Яго сутнасьць — у яднаньні нацыянальных сілаў на хрысьціянскіх прынцыпах. Самы час наводзіць парадак у старэйшым пакаленьні апазыцыі». Павал таксама прызнаўся, што піша кніжкі. Адна зь іх, «Нацыянальная ідэя», ужо гатовая да друку. Павал зьбіраецца паспрабаваць сябе і ў журналістыцы.

Зьмена кіраўніка ў «Маладым фронце» адбываецца без удзелу «старэйшых таварышаў». Летась маладафронтаўцы адышлі ад БНФ і пачалі жыць самастойна. Яны ж утварылі асобны перадвыбарчы блёк «Маладая Беларусь».

# Сяржук Лісічонак: Элітарная арганізацыя

**«НН»: Ня страшна застацца без Севярынца?**

**С.Л.:** Севярынец усё яшчэ наш кіраўнік. І самае галоўнае — ён наш вялікі дарадца, які прайшоў столькі кампаніяў, столькі палітычных баталіяў. Ад ягонай дапамогі нам яшчэ ранавата адмаўляцца. Таму Павал заўжды будзе прысутнічаць на нашых мерапрыемствах, акцыях. Я мяркую, заўжды будзе недзе побач.

**«НН»: А што канкрэтна «Малады фронт» можа прапанаваць моладзі? Як Вы зьбіраецеся змагацца за яе з тым самым БРСМ?**

**С.Л.:** У БРСМ цягнуць людзей, а да нас людзі мусяць прыйсьці самі. Прычым ня кожнага возьмем, таму ў нас больш элітарная арганізацыя. Мы прапануем ідэі, заснаваныя на маральнай чысьціні, адкрытасьці й праўдзе. У нас няма падвойных стандартаў, мы адкрыта кажам, што чорнае, а што белае, дабро альбо зло ў беларускім грамадзтве. Мы прапануем людзям дакладную альтэрнатыву.

**«НН»: Ці стане МФ палітычнай партыяй?**

**С.Л.:** Заўчаснае пытаньне. Я пра такія настроі чуў, але не магу сказаць, што яны пашыраныя ў арганізацыі.

**«НН»: Як Вы ставіцеся да выступу Паўла Севярынца на БТ з крытыкай апазыцыйнай «Пяцёркі-плюс»? Калі б Вам прапанавалі зрабіць камэнтар па палітычнай сытуацыі ў Беларусі, ці крытыкавалі б Вы апазыцыю?**

**С.Л.:** Я не пайшоў бы на БТ і не казаў бы там пра нейкія не зусім прыемныя рэчы, якія існуюць у асяродзьдзі апазыцыі.

**«НН»: Якімі Вам бачацца адносіны з Партыяй БНФ?**

**С.Л.:** Спадзяюся, што ў будучыні мы зможам знайсьці паразуменьне. І ня толькі з Партыяй БНФ, але і зь іншымі суб'ектамі беларускай палітыкі.

**«НН»: Ці верыце Вы ў рэальнасьць стварэньня ў палаце фракцыі «Маладой Беларусі»?**

**С.Л.:** Я кіраўнік перадвыбарчага штабу!.. Не ўзначаліў бы, каб ня верыў. Мінімум пяць чалавек могуць туды прарвацца. Гэта такія прыхаваныя атамныя бомбы, якія могуць рэальна зьнесьці перашкоды на сваім шляху.

**«НН»: Які дзяяч беларускай гісторыі зьяўляецца для Вас ідэалам?**

**С.Л.:** Леў Сапега. Мы зь ім — калегі па цэху. Я імкнуся рабіць у арганізацыі тое, што рабіў Леў Сапега для ўсёй краіны.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сяргей Лісічонак** нарадзіўся ў Менску ў 1980. Летась скончыў юрфак БДУ, цяпер вучыцца ў Беларускім дзяржаўным эканамічным унівэрсытэце на спэцыяльнасьці «Эканоміка і кіраваньне прадпрыемствам». У МФ з 1999, сябар Партыі БНФ, уваходзіў у партыйны Сойм, быў сакратаром міжнароднай камісіі. Найлепшы «Ды-джэй Адраджэньня'2000». Цяпер узначальвае міжнародны аддзел МФ, штаб перадвыбарчага блёку «Маладая Беларусь», зьбіраецца балятавацца ў палату прадстаўнікоў у Менску.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Зьміцер Дашкевіч** нарадзіўся ў 1980 у в.Кушняры Івацэвіцкага раёну. Школу скончыў у Старых Дарогах, паступіў у Гарадзенскі агратэхнічны ўнівэрсытэт, але там яму не спадабалася. Цяпер студэнт 2-га курсу факультэту славістыкі Віленскага пэдунівэрсытэту. Вывучае беларускую філялёгію і журналістыку. У МФ з 2001, быў адказным за правядзеньне масавых акцыяў, неаднаразова затрымліваўся міліцыяй, агулам правёў за кратамі каля трох месяцаў. Старшыня Менскай гарадзкой рады МФ, сябар Партыі БНФ. Зьбіраецца ўдзельнічаць у выбарах у палату прадстаўнікоў у Старых Дарогах.

# Зьміцер Дашкевіч: Змагацца на вуліцах

**«НН»: Зьміцер, што Вы зробіце, калі Вас выберуць кіраўніком?**

**Зьміцер Дашкевіч:** Галоўным прыярытэтам у дзейнасьці будзе актыўнае змаганьне з рэжымам на вуліцы. Іншае — другаснае.

**НН: А ці магчыма сёньня вывесьці моладзь на вуліцу?**

**З.Д.:** Магчыма. Галоўнае — працаваць у гэтым кірунку. Перад намі прыклад вясны 1996 г. «Малады фронт» утварыўся на вуліцы і мусіць там заставацца… Калі перастануць хадзіць на вулічныя акцыі тыя сёньняшнія некалькі сотняў людзей, у рэжыму зьдзейсьніцца ўражаньне, што ўсіх усё задавальняе. І могуць пачацца яшчэ большыя рэпрэсіі. Цяпер, на жаль, адзінае, што мы можам рабіць, — гэта трымаць рэжым у страху, напружваць яго ўвесь час. Бо тыя пару соцень людзей нічога кардынальна зьмяніць ня могуць. Але Лукашэнка і ягоная дружына будуць ведаць, што супраціў у Беларусі ёсьць і ў пэўны момант ён можа ператварыцца ў лявіну.

Лукашэнка і імпэрыялістычная Расея — нашыя ворагі. І тое што Лукашэнка цяпер займае нібыта незалежніцкую пазыцыю, — папулізм.

**«НН»: Хто сёньня прыходзіць у арганізацыю?**

**З.Д.:** Студэнты, школьнікі, моладзь пасьля ВНУ. Сярэдні іх узрост — каля 19 гадоў. Дарэчы, цяпер ствараецца незалежны студэнцкі прафсаюз — апалітычная арганізацыя, якая, аднак, цалкам складаецца з маладафронтаўцаў.

**«НН»: Ці хопіць МФ сілаў, фінансаў, каб правесьці сваіх кандыдатаў у палату прадстаўнікоў?**

**З.Д.:** Ня думаю, што Лукашэнка жадае бачыць кагосьці з нас у палаце. Не выключаю, што здымуць нават пераможцаў. Зь іншага боку, з дапамогай «Маладой Беларусі» мы выводзім моладзь на якасна іншы ўзровень палітычнай дзейнасьці. Я асабіста стаўлюся да выбараў як да этапу ў працэсе дэмакратызацыі грамадзтва.

**«НН»: Які дзяяч беларускай гісторыі зьяўляецца для Вас ідэалам?**

**З.Д.:** Янка Купала, народны пясьняр.

**Падрыхтаваў Сяргей Ёрш**

# Прэміі «Intex-press» і Калінкінай

Рэдакцыя баранавіцкай газэты «Intex-press» і галоўная рэдактарка «Белорусской деловой газеты» Сьвятлана Калінкіна сталі ляўрэатамі прэміі імя Герда Буцэрыюса «Маладая прэса Ўсходняй Эўропы» за 2003 г. Уручэньне прэміі адбудзецца 19 траўня ў Гамбургу. Далучаемся да віншаваньняў!

**НН**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

**4 лютага кіраўніцтва маладачанскай друкарні зладзіла цэнзуру газэты «Вольнае Глыбокае».** Без дазволу рэдакцыі матэрыял пра зьезд Партыі БНФ быў заменены на надпіс: «Тут магла б быць ваша рэкляма». Старшыню беларускага страйкаму прадпрымальнікаў **Валер'я Леванеўскага** 4 лютага выклікалі ў Ленінскі РУУС Горадні для тлумачэньняў, навошта прадпрымальнік рассылаў па дыппрадстаўніцтвах навагоднія віншаваньні. Міліцыянты пры гэтым карысталіся лістом ад В.Леванеўскага да дыпляматаў Украіны. З нагоды парушэньня права на таямніцу перапіскі прадпрымальнік напісаў скаргу ў пракуратуру. 5 лютага віцебскага актывіста КХП-БНФ **Уладзімера Плешчанку** падчас збору подпісаў за скасаваньне саюзнай дамовы затрымаў АМОН. У Чыгуначным судзе Віцебску яго зьвінавацілі ў несанкцыяваным пікетаваньні й аштрафавалі на 2 млн 800 тыс. руб. Міністэрства інфармацыі 5 лютага прыпыніла на месяц выхад газэты **«Згода».** Выданьне вінавацяць у зьмене юрыдычнага адрасу без паведамленьня ў Мінінфармацыі, парушэньні міждзяржаўнага стандарту ДАСТ, выходзе толькі па-расейску й па-беларуску, а не на ўсіх мовах, пералічаных у рэгістрацыйным пасьведчаньні. Берасьцейскі суд 6 лютага адхіліў скаргу кіраўнічкі гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ **Ніны Давыдоўскай** на рашэньне адміністрацыйнай камісіі Маскоўскага раёну. Камісія аштрафавала Давыдоўскую на 49 тыс.руб за раздачу ўлётак у Міжнародны дзень правоў чалавека 10 сьнежня. 9 лютага навалацкі рэсурсавы цэнтар **«Усяслаў Чарадзей»** атрымаў пісьмовае папярэджаньне: органы юстыцыі лічаць, што арганізацыя парушыла заканадаўства, бо не разьмяшчаецца па сваім юрыдычным адрасе — у будынку аддзелу культуры гарвыканкаму.

**АШ**




**11-й дзень у Віцебску працягваецца галадоўка прадпрымальнікаў.**

З УСЁЙ КРАІНЫ

## Тры «гарады» ў Берасьці

**Старыя парахавыя склады ў мікрараёне Кавалёва ў Берасьці, пабудаваныя яшчэ ў канцы XIX ст., у хуткім часе ператворацца ва ўнікальны гандлёвы комплекс.** Таварыства з абмежаванай адказнасьцю «Ідэя», што выкупіла ва ўласнасьць гэтыя склады, на плошчы ў два гектары мяркуе стварыць новы гандлёвы комплекс пад назвай «Старый город», у якім будуць пераплятацца сівая даўніна і сучасныя тэхналёгіі. За тры-чатыры месяцы новыя гаспадары складаў абяцаюць ператварыць іх у гандлёвыя рады для продажу прадуктаў. А на плошчы перад імі паводле праекту вядомага берасьцейскага архітэктара Аляксея Андраюка будзе пабудаваны рэчавы міні-рынак у выглядзе драўлянага гораду, які нагадвае старадаўняе Берасьце.

Прычым ня толькі дамы будуць складзены з сасновага зрубу, але і вуліцы вымашчаны драўлянымі насьціламі. Агулам пад будучыя крамы плянуецца пабудаваць 90 такіх драўляных дамкоў. Першую чаргу гандлёвага комплексу, які пазьней можа стаць упрыгожаньнем сучаснага гораду і галоўным рынкам новага вялікага мікрараёну, мяркуецца запусьціць ужо пад канец гэтага году.

А перад гэтым ужо пасьпелі пабудаваць кавярню «Старый городъ». Справа ў тым, што ў Берасьці на пачатку 1990-х утварылася і пасьпяхова дзейнічае арганізацыя «Стары горад», і падобныя акцыі ёсьць яшчэ адным «ноў-хаў» рэжыму па ліквідацыі незалежнай арганізацыі. Асабліва ўражвае абраны для шыльды малюнак, калі ўлічыць, што менавіта маскалі і нішчылі адлюстраваныя на ім дамы.

**ПБ, Берасьце**

## Застаўся на Радзіме

**Партрэт Уладзімера Караткевіча, створаны Аляксеем Марачкіным, зь вялікім посьпехам быў прэзэнтаваны летась у Воршы.** Пасьля выставы мастак прапанаваў гораду набыць карціну для мясцовага музэю Караткевіча. На жаль, нават той сымбалічнай сумы, запрошанай аўтарам, гарадзкія ўлады не знайшлі. Ніхто не адгукнуўся й на заклік музэйшчыкаў пералічыць грошы для набыцьця карціны на адпаведны рахунак, надрукаваны ў газэтах. Тым ня менш, цудоўны твор знакамітага майстра застаўся на радзіме паэта. Яго набыла ў прыватную ўласнасьць прадпрымальніца з Барані Галіна Пузікава. Дзіўна, але партрэт чамусьці ня трапіў у музэй. Уладальніца перадала яго на часовае экспанаваньне ў гарадзкую бібліятэку імя Пушкіна. У чытальнай залі цяпер кожны можа павітацца з маладым усьмешлівым Караткевічам.

## Крыжы на ананімных могілках

**Хутка зьявяцца крыжы на могілках ля вёскі Савішчына Аршанскага раёну.** І хоць нябожчыкаў хаваюць тут з 1983 г. ды ўжо маецца звыш тысячы магілаў, ні помнікаў, ні агароджаў няма. Нават імёнаў пахаваных не даведаешся — толькі нумары на шыльдачках, — бо ляжаць тут тыя, ад каго адмовіліся родзічы, былыя вязьні зь дзьвюх мясцовых турмаў, невядомыя тапельцы, самазабойцы, бамжы. Хутка на магільных пагорачках будуць ставіць драўляныя ці жалезабэтонныя крыжы. Але нябожчыкаў, у большасьці якіх жыцьцёвы шлях быў далёкі ад хрысьціянскага, па-ранейшаму будуць закопваць пад нумарамі.

## Блакітныя елкі ў печ

**Сьпілаваныя вялізныя блакітныя елкі, якія расьлі перад будынкам Аршанскага гарвыканкаму.** Каб не ствараць праблемаў для транспарту і пешаходаў, зроблена тое было ноччу. Гэта адразу выклікала сярод месьцічаў чуткі і неразуменьне. Як патлумачыў дырэктар спэцыялізаванага прадпрыемства «Арыён» Міхаіл Кутузаў, дрэвы зацямнялі чыноўніцкія кабінэты, а магутныя карані стваралі пагрозу падмуркам. Да таго ж, дэкаратыўныя елкі павінны мяняцца праз кожныя дзесяць гадоў (цікава, што пасаджаныя новыя елачкі прыблізна такога ўзросту, бо растуць яны ня так хутка). Дарэчы, сьпілаваныя блакітныя прыгажуні былі дарма перададзеныя адзінокім пэнсіянэрам на дровы.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Адстрэл зуброў

**Зьнішчыць дзясятак зуброў на Асіповіччыне — такое рашэньне прыняло Мінпрыроды.** Такім чынам, афіцыйна прызнаецца памылковасьць усталяванага для навакольнага асяродзьдзя Асіповіцкага раёну памеру зубрынага статку ў 50 галоваў. Да адстрэлу выбраны тры самкі нерэпрадуктыўнага ўзросту і самец, які чамусьці бадзяецца сам сабою. Адстрэл жывёлін, як і раней (у 2002 і 2003-м былі забітыя два зубры), будзе весьціся замежнымі паляўнічымі.

**Рыгор Латышэвіч, Асіповічы**

# Раззбраеньне ня ў модзе

**Беларуская навука можа пазбыцца аднаго зь міжнародных фундатараў. Прычына — канфлікт уладаў з прадстаўніцтвам Міжнароднага навукова-тэхнічнага цэнтру (МНТЦ), які выдаткоўваў сродкі на канвэрсійныя праекты.**

«Мы не разбурылі сваёй вайсковай вытворчасьці, як раілі некаторыя, і цяпер зарабляем на ёй вялікія грошы», — гэтыя словы часта паўтараюць прадстаўнікі ўладаў. Канвэрсія ў іх не ў пашане. Здаецца, менавіта гэта і стаіць за кулісамі юрыдычнага канфлікту ў МНТЦ. Беларусь і кіраўніцтва МНТЦ ня могуць прыйсьці да адзінага меркаваньня пра статус прадстаўніцтва гэтай міжнароднай арганізацыі. Паводле словаў намесьніка кіраўніка місіі Анатоля Дашука, кантрольныя органы лічаць прадстаўніцтва замежнай юрыдычнай асобай. А кіраўніцтва МНТЦ настойвае, што гэта прадстаўніцтва міжурадавай арганізацыі, у якой нароўні зь іншымі краінамі СНД удзельнічае й Беларусь. Розныя падыходы адбіваюцца ня толькі на юрыдычным статусе, але й на падатках і інш.

За час дзейнасьці МНТЦ у краіне фінансаваньне атрымалі больш за 60 праектаў, прычым агульны аб’ём фінансаваньня перавысіў 24 млн даляраў. Канфлікт паміж кіраўніцтвам МНТЦ і ўладамі ўзьнік пры канцы 2003 г. На сёньня МНТЦ не прымае на разгляд новых праектаў.

МНТЦ узьнік у лістападзе 1992 г. у выніку міжурадавага пагадненьня, падпісанага Эўразьвязам, Японіяй, ЗША і Расеяй. Мэта арганізацыі — пераарыентаваць «вайсковых» навукоўцаў на мірную дзейнасьць і спрыяць пераходу постсавецкай навукі да рынкавых адносінаў.

**Аркадзь Шанскі**

ДАСЛОЎНА

## Задача журналістам

«У адных калгасах каровы даюць па 5 тысячаў літраў малака, у іншых — паўтары тысячы. Таму праз карову трэба паказаць і ролю кіраўніка, і ролю даяркі».

**Уладзімер Адашкевіч,** старшыня Аршанскага райвыканкаму, на сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Рост мабільнай сувязі

Колькасьць абанэнтаў расьце як на дражджах. За адзін студзень іх пабольшала на 3,8%. Рост у МТС склаў 6,3%, у «Velcom» —1,5%.

## Звышкірмашы ў сталіцы

Да канца 2004 у сталіцы зьявяцца два першыя гіпэрмаркеты, а ў 2005—2007 — яшчэ 11. Плошча кожнага ў 3—5 разоў большая за плошчу ЦУМу. Першыя звышкірмашы будуюцца на рагу Ракасоўскага і Ванеева ў Серабранцы (замоўца — замежнае прадпрыемства «БелВілесдэн») і на скрыжаваньні Лабанка і Акадэміка Фёдарава ў Сухараве (замоўца — СП «Гандальоптыма»). Усяго пад гіпэрмаркеты гарвыканкам вылучыў 13 пляцовак у розных раёнах. Умовы для забудоўнікаў такія: з асартымэнту (10—40 тыс. тавараў) мінімум палову мусіць складаць прадукцыя беларускай вытворчасьці. Толькі пятую частку агульнай плошчы крамы ўласьнік мае права здаваць у арэнду. Нарэшце, штомесяц трэ будзе адлічваць ня менш за 1% ад тавараабароту на разьвіцьцё гарадзкой інфраструктуры.

Пабудова аднаго маркету каштуе $4,5—6 млн. Сродкі маюць акупіцца за 7—10 гадоў. Пабудова гіпэрмаркетаў цяжка адаб’ецца на дробных крамах. Кожнае працоўнае месца, створанае ў гіпэрмаркеце, ліквідуе сем у традыцыйным гандлі. Сусьветна вядомыя сеткі маркетаў («Auchan», «Lidl», «Metro», «Real», «Wal-Mart») у Беларусь пакуль не ідуць.

## «Гарызонт» працуе на Расею

«Гарызонт» выпусьціў летась 400 тыс. тэлевізараў, але хацеў бы падвоіць гэтую лічбу ў 2004 г. Пры гэтым у Расею экспартуецца каля 60% прадукцыі.

## Зь перавыкананьнем

Летась кансалідаваны бюджэт выкананы на 107,1%. Замежная запазычанасьць краіны зьнізілася з $813 да 736 млн. Унутраная запазычанасьць складае 6% ад ВУП. (Гэта зьвесткі Мінфіну.)

## Рост МАЗу

Продажы МАЗу вырасьлі летась на 8,9% — да $321,8 млн. Завод вырабіў 15 431 грузавік (+9,2% проці 2002), 481 аўтобус (+3,7%), 4 тыс. 109 прычэпаў (+15,9%).

## Ёсьць мільён яек!

За 2003 г. беларускія перапёлачкі выседзелі каля мільёна яечак. Гэта ў паўтары тысячы разоў менш, чым у курэй. Ды ўсё ж уражвае. Да таго ж, перапяліныя яйкі дыетычныя і гіпаалергенныя.

## Даляр—эўра: няяснасьць

ЗША і іх хаўрусьнікі з групы G7 «дасягнулі кампрамісу ў справе падзеньня даляра». Сутнасьць рашэньня застаецца настолькі ж туманнаю, як і яго фармулёўка. Большасьць аналітыкаў ня бачаць пакуль у найбольшых фінансавых гульцоў сьвету гатоўнасьці мяняць тэндэнцыі на рынку.

## У Казахстане радасьць

Хуткае ўвядзеньне ў дзеяньне нафтаправоду Адэса—Броды натхняе Астану. Казахстану для нармальнага экспарту сваіх гіганцкіх (44 млрд барэляў) запасаў патрэбныя яшчэ дзьве трубы памеру існай, да Новарасійску. Пабудова чарговае (Баку—Джэйхан, турэцкі тэрмінал на Міжземнамор’і) скончыцца ў наступным годзе. 1760-кілямэтровы шлях стане першым, па якім нафта пацячэ без кантролю Расеі. На сёньня з 16 галоўных нафтаздабыўных праектаў у Казахстане расейскія кампаніі ўдзельнічаюць толькі ў трох, і тое ў якасьці меншасных акцыянэраў. Таму Расея спрабуе ўсяляк затармазіць як праект Адэса—Броды, так і Баку—Джэйхан. Парадаксальна, што яна знаходзіць сабе ў гэтым саюзьнікаў — арабскія краіны.

## Расея павялічвае здабычу

На думку старшыні рады дырэктараў «Юкасу», Расея ў 2009 г. можа выйсьці на першае месца ў сьвеце па здабычы нафты, абышоўшы Саудаўскую Арабію. У 2003 г. вытворчасьць нафты ў Расеі вырасла на 11%. У 2004 г. яна чакаецца на ўзроўні 9 млн барэляў у дзень.

**МБ; РБК, АФН, «Звязда», «Частная собственность»**

# Саамы сьвяткуюць

**6 лютага саамы адзначылі свой нацыянальны дзень. У Швэцыі сьвята прайшло ў сталічным парку Скансэн. Цэлы дзень каля дзьвюх тысячаў стакгольмскіх саамаў танчылі, пелі, слухалі лекцыі палітыкаў пра свае правы.**

Гісторыя гэтага найстаражытнейшага народу аленяводаў поўначы Эўропы трагічная і цікавая. Калісьці саамы засялялі амаль усе абшары сучаснай Швэцыі, Нарвэгіі, вялізную частку Фінляндыі і Кольскую паўвыспу Расеі. Першыя зьвесткі пра саамаў — «sennі» — пакінуў старажытнарымскі гісторык Тацыт у 98 г. ад Н.Х. У 1603 г. Швэдзкая карона, да якой належалі амаль усе землі саамаў, распачала хрост гэтага народу. Разам з хростам прыйшла асыміляцыя, бо мовамі багаслужбы сталіся швэдзкая і фінская. Адсутнасьць нацыянальнай царквы — дагэтуль праблема саамскага руху. У 1673 г. пачалася афіцыйная швэдзкая праграма калянізацыі саамскіх земляў. Менавіта ў гэтых мэтах прафэсар Упсальскага ўнівэрсытэту Ёханэс Шэфэрус падрыхтаваў і надрукаваў фундамэнтальную працу «Гісторыя Ляпляндыі», у якой апісаў мову, культуру і побыт ляпароў, ці саамаў. У 1685 г. было разбурана апошняе саамскае паганскае капішча. У 1720—29 г. адбылася прымусовая дэпартацыя саамаў з цэнтральна-паўночных у гранічна-паўночныя раёны Швэдзкага каралеўства. Усіх саамаў абавязалі жыць выключна ў межах правінцыі Ляпляндыя. У 1755 г. выйшла друкам першае выданьне Новага Запавету па-саамску. У 1780 г. быў надрукаваны саамска-швэдзка-саамскі слоўнік. У 1811 г. на адзін з дыялектаў саамаў была цалкам перакладзеная Біблія.



Эльса Рэнбэрг

У выніку палітычных падзелаў XIX — пачатку XX ст. этнічная прастора саамаў апынулася пад уладай трох дзяржаваў: Швэцыі, Нарвэгіі і Расеі (Вялікае княства Фінляндзкае). У 1852 г. на нарвэскіх землях выбухнула нацыянальнае паўстаньне саамаў.

Сучасны нацыянальны рух саамаў стартаваў адначасова зь беларускім. У 1906 г. адзін зь лідэраў руху настаўнік Ісак Саба (1875—1921) стварае нацыянальны гімн і рэпрэзэнтуе саамаў як сэнатар фінскага парлямэнту Расейскай імпэрыі. Невядомай старонкай ёсьць тагачасныя сувязі беларускіх і саамскіх нацыяналістаў. У 1914 г., падчас побыту ў Фінляндыі, Алаіза Пашкевіч (Цётка) сустракалася зь лідэркай саамскага руху Эльсай Рэнбэрг.

У адказ на саамскі рух швэдзкія і расейскія ўлады распачынаюць рэпрэсіі супраць саамскай культуры. Да 1920-х чыняцца забароны на ўжываньне саамскай мовы.

6 лютага 1917 г. у нарвэскім Трандхейме адбыўся першы Ўсесаамскі кангрэс, на якім пад кіраўніцтвам Эльсы Рэнбэрг больш за тысячу дэлегатаў з усіх куткоў Вялікай Саамі вызначылі дамагацца палітычнай і культурнай аўтаноміі ўласнай зямлі. 6 лютага для саамаў сталася тым самым, што 25 сакавіка для беларусаў. Увесь час забароненае сьвята, як ліхтарык надзеі, не давала зьнікнуць саамскаму руху. Сьвята 6 лютага афіцыйна прызнанае ўрадамі Швэцыі, Нарвэгіі, Фінляндыі і Расеі толькі ў 1993 г.

Сёньня засталося толькі 40 тыс. неасыміляваных саамаў, зь якіх дзьве тысячы, як і раней, займаюцца аленегадоўляй. Ва ўсім сьвеце саамаў вядомыя праз свае арыгінальныя чырвоныя шапкі, мастацтва вырабу нажоў і цудоўныя песьні «джойк», якія найпрост адлюстроўваюць стан душы і надвор'я.

Сучаснае палітычнае і культурнае становішча саамаў рознае. Інтэграцыю саамаў ускладняюць межы розных дзяржаваў ды розныя дыялекты (агулам іх восем), якія лінгвісты лічаць рознымі мовамі. Напрыклад, у Расеі жыве тры групы саамаў: Тэр, Кільдын і Скольт. Тэр-саамы цалкам асыміляваныя. Дзьве астатнія групы пры падтрымцы саамаў Фінляндыі маюць свае культурныя цэнтры (Лавозева і Пэтсама) і захоўваюць мову.

У Фінляндыі саамы маюць найлепшыя правы, парлямэнт, мову, газэты і кнігі, радыё і тэлебачаньне.

У Швэцыі саамская мова ёсьць адной з афіцыйных моваў дзяржавы. У шэрагу паўночных камунаў саамская мова ёсьць мовай адміністрацыі. Тамсама існуюць саамскія школы. Швэдзкі ўнівэрсытэт у горадзе Ўмэо дае магчымасьць саамам атрымаць на роднай мове вышэйшую адукацыю. З 1952 г. працуе нацыянальнае саамскае радыё Швэцыі. На цэнтральных каналах ТБ штотыдзень выходзяць навіны па-саамску. Ёсьць мясцовыя каналы ТБ. Швэдзкі ўрад фундуе дзяржаўную праграму разьвіцьця саамскага Інтэрнэту. Усе саамы Швэцыі свабодна размаўляюць па-швэдзку. Але, дзякуючы дзяржаўнай праграме і руху актывістаў, колькасьць носьбітаў саамскай мовы ў Швэцыі застаецца стабільнай (20 тыс. чалавек). У швэдзкай Ляпляндыі існуе саамскі парлямэнт. Нягледзячы на посьпехі ў абароне сваіх правоў, дзеячы саамскага руху маюць актуальныя пытаньні да Стакгольму. Сярод іх праблема фінансаваньня. Саамскія лідэры дамагаюцца, каб сродкі бюджэту дзяржаўнай праграмы разьвіцця саамскай культуры разьмяркоўваліся ня ўрадам Швэцыі, але непасрэдна саамскай адміністрацыяй. Таксама ідзе барацьба за адкрыцьцё поўнай дзяржаўнай саамскай гімназіі ў Стакгольме. Пры ўсіх праблемах настрой швэдзкіх саамаў 6 лютага быў шчыра сьвяточны.






Тэрыторыя сучаснага расьсяленьня саамаў.

**Андрэй Катлярчук, уласны карэспандэнт «НН» у Швэцыі**

# «Гішпанка» была птушыным грыпам

**Жахлівая «гішпанка» ў 1918 г. забіла каля 40 млн чалавек — больш, чым першая сусьветная вайна. Як цьвердзяць амэрыканскія дасьледнікі, той вірус быў птушыны.**

Людзі звычайна хварэюць на грып, які пераносіцца з птушкі на жывёлу (напрыклад, сьвіней), мутуе і толькі пасьля «кідаецца» на чалавека. Пры непасрэдным пераходзе заразы ад птушкі чалавечы імунітэт ня можа адразу выявіць і зьнішчыць вірус. Давядацца пра гэта амэрыканскім навукоўцам дапамагла найноўшая тэхніка і пахавальныя абрады эскімосаў.

Грып — адна з найбольш распаўсюджаных хваробаў у сьвеце. Мінулае стагодзьдзе было адзначанае трыма яго пандэміямі — 1918, 1957, 1968 г.

Самай забойчай была пандэмія 1918 г., прazваная «гішпанка». Тады ад грыпу памерла 20—50 млн асобаў.

Прычыны эпідэміі было цяжка высьветліць — толькі ў 30-я людзі даведаліся, што грып выклікаюць вірусы. Таму пробаў вірусу ў 1918-м ніхто не рабіў. Чыста выпадкова ў Інстытуце паталёгіі Амэрыканскага войска знайшліся фрагмэнты лёгкіх жаўнераў, што памерлі ад гішпанкі. Элемэнты вірусу знаходзілі й у эскімосаў, якія хварэлі на гішпанку і былі пахаваныя ў вечнай мерзлаце на Алясцы. Вылічыўшы ДНК вірусу, навукоўцы здолелі рэканструяваць ген, адказны за прадукаваньне галоўнага бялку — гемаглютыніну. Той дазваляе вірусу распазнаць і прычапіцца да часьцінак нашых лёгкіх, а потым зьнішчаць іх. Яго таксама распазнае чалавечы імунітэт, і ад гэтага залежыць, як цяжка будзе праходзіць хвароба. Параўноўваючы гемаглютынін вірусу «гішпанкі» зь бялкамі, якія паходзяць ад чалавечых і сьвіных мікробаў, навукоўцы давялі: мікраарганізмы 1918 г. больш падобныя да птушынага, чым да чалавечага вірусу! Вось чаму вірус «гішпанкі» быў такі забойчы. Яго бялок гэтак адрозніваўся ад чалавечых вірусаў, што наш арганізм ня быў у стане яго распазнаць і хутка зрэагаваць на заражэньне.

Апроч таго, тыповы чалавечы грып найбольш небясьпечны для асобаў у сталым веку. У выпадку гішпанкі было ўсё наадварот. Чаму? Навукоўцы з Каліфорніі кажуць, што старыя мелі часткова імунітэт ад папярэдняй эпідэміі (першая эпідэмія птушынага грыпу апісаная ў Італіі ў 1878 г.).

Ці азначае ўсё гэта, што птушыны грып, які зьявіўся ў Азіі, можа ператварыцца ў сусьветную пандэмію? Вучоныя кажуць, што рызыка пераскокваньня птушынага грыпу на людзей існуе, але змагацца цяпер прасьцей: яны ведаюць ворага ў твар.

**Падрыхтаваў Руслан Равяка паводле замежнай прэсы**

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Доўга жывём

**Сярэдняя працягласьць жыцьця на Зямлі на сёньня складае ўсяго 48,5 году.** А вось сярэднестатыстычны беларус жыве 68,5 году. Калі браць іншыя краіны былога СССР, дык сярэдні расеец жыве 67,5 году, украінец 66,33, казах 63,38, затое эстонец — 70,1 году, літовец — 69,2 году, латыш — 69 гадоў. Найбольшая ў сьвеце працягласьць жыцьця — у глухой Андоры (83,48 году), Сан-Марына (81,33) і шумлівым Сынгапуры. Пасьля ўжо ідзе Японія (80,91). Найменш адпушчана жыць жыхарам тых краінаў, дзе найбольш лютуе СНІД: у Батсване людзі жывуць толькі 35,29 году. Для параўнаньня: сярэдняя працягласьць жыцьця ў Нямеччыне 77,78 гадоў.

## Тое, што іх яднае

**Прыбыткі расейскіх палітыкаў мала залежаць ад пераканаńняў.** Цэнтральная выбарчая камісія Расеі апублікавала зьвесткі пра даходы за 1999—2002 гады, а таксама пра маёмасьць зарэгістраваных кандыдатаў: зьніклага Івана Рыбкіна (пратэжэ Беразоўскага), лібэралкі Ірыны Хакамады і нацыяналіста Сергея Глазьева. Згодна з ЦВК, Рыбкін за гэты час меў даходы 2 млн 290 тыс. расейскіх рублёў (каля 90 тыс. даляраў). Езьдзіць Рыбкін на «Саабе». Хакамада за чатыры гады зарабіла 1 млн 750 тыс. рублёў і мае «Пантыяк» і «Мэрсэдэс». Глазьеў атрымаў 1 млн 525 тыс. рублёў даходу. Сярэдні ж расеец за гэтыя чатыры гады зарабіў ад сілы 150 тыс. рублёў.

## Галадоўка азэрбайджанскай апазыцыі

**Лідэры азэрбайджанскай апазыцыі, якія ад часу выбараў трымаюць у турме, у панядзелак пачалі галадоўку.** У пратэсьце ўдзельнічаюць намесьнікі старшыні апазыцыйнай партыі «Мусават» Арыф Гаджыеў і Рауф Арыфаглы. Яны патрабуюць свайго вызваленьня. Арыштаваныя яны былі за арганізацыю пратэстаў супраць фальшаваньня вынікаў выбараў прэзыдэнта Азэрбайджану 15 кастрычніка 2003 г.

## Інтэрнаты для сэкс-маньякаў

**56% жыхароў Швайцарыі на нядзельным рэфэрэндуме падтрымалі спрэчную ідэю новага пакараньня для сэксуальных маньякаў.** Прынятая папраўка ў канстытуцыю прадугледжвае, што, калі спэцыялісты падазраюць у злачынцы рызыку рэцыдыву, такі ліхадзей і пасьля адбыцьця тэрміну ня выйдзе на свабоду, але застанецца інтэрнаваны «да канца жыцьця, бяз права на звальненьне ці выхад з калёніі на выходныя». Адзіным шанцам выйсьці будзе для яго новае навуковае абсьледаваньне. Крытыкам артыкулу асабліва не падабаецца тое, што вырак будзе выносіць не судзьдзя, а экспэрт-псыхіятар.

## Сэрца апошняга Людовіка

**8 чэрвеня 2004 г. у каралеўскую пахавальню базылікі Сэн-Дэні зямлі будзе перададзена сэрца Людовіка XVII.** Дзевяцігадовы сын пакаранага сьмерцю францускага караля Людовіка XVI памёр ад сухотаў у вязьніцы Тампль каля 200 гадоў таму. Хоць хлопчык ніколі не каранаваўся, ён прызнаецца гісторыкамі і арыстакратычнымі фаміліямі Эўропы каралём з правам свайго нараджэньня. Пасьля сьмерці Людовіка яго сэрца засьпіртавалі. Праз нейкі час яно трапіла да каралеўскай дынастыі францускіх Бурбонаў і захоўвалася як сямейная рэліквія. У красавіку 2000 г. быў праведзены генэтычны аналіз ДНК тканак сэрца, які пацьвердзіў яго сапраўднасьць. Цяпер Міністэрства культуры, якое вядзе нагляд за пахавальняй, дало дазвол на пахаваньне побач з магіламі іншых манархаў сэрца юнага Людовіка. Пасьля доўгіх спрэчак была прызначана дата — 8 чэрвеня — дзень народзінаў Людовіка XVII.

## Помнік НЛА

**Першы ў Эўропе помнік лятучым талеркам мае адкрыцца 10 траўня ў мясцовасьці Эмільцін каля Аполя (Польшча). Ідэя стварэньня манумэнту належыць гарадзкім уладам і фонду «Наўтылус».** Падчас цырымоніі адкрыцьця дзень 10 траўня абвесьціць Сусьветным днём НЛА.

Помнік будзе пастаўлены на месцы, дзе 10 траўня 1978 г. селянін Ян Вольскі ўбачыў іншапляnэтнікаў. З таго часу ў Эмільцін з усяго сьвету едуць ахвотныя сустрэць НЛА. Помнік мае прыцягнуць яшчэ больш турыстаў.

**Франц Субель**

# Куды зьнікаюць

**Хтосьці эмігруе, хтосьці шыецца ў вэртыкальшчыкі, хтосьці ганяе на продаж іншамаркі. За трынаццаць гадоў навукоўцаў паменела на 77 тыс. Беларуская навука перажывае катастрофу.**




Наша навука, як і паўсюль у найноўшы час, разьвівалася адпаведна патрэбам грамадзтва. І адпаведна ягоным магчымасьцям. У пачатку XX ст., з утварэньнем новае беларускае дзяржаўнасьці, перад навукай была пастаўленая даволі сьціплая задача: вывучаць краіну. З гэтай мэтаю й быў утвораны ў 1922 г. Інбелкульт. Акцэнт рабіўся на этнаграфію, гаспадарку, гістарычную спадчыну.

З курсам на індустрыялізацыю дзяржаву зацікавілі рэчы прагматычныя. Трэ было даznaцца пра эканамічныя магчымасьці, прыродны патэнцыял, стварыць базу для сацыяльных пераўтварэньняў. Перад Акадэміяй навук былі пастаўленыя канкрэтныя мэты дасьледаваньняў у розных галінах геалёгіі й картаграфіі, заалёгіі й батанікі, мэдыцыны й хіміі. Менск стаў безальтэрнатыўным цэнтрам інтэлектуальнае сілы нацыі. Сюды паварталіся й пераехалі слынныя навукоўцы. У Беларусі стала магчымаю падрыхтоўка навуковых кадраў ці не ва ўсіх галінах ведаў. Узьлёт быў неўзабаве перарваны. Кулямі й кайданамі. Страхам і нішчымніцай. Пачаўся першы акт драмы беларускае навукі. Хоць перад вайной не было вялікіх фундамэнтальных адкрыцьцяў, галоўнае адкрыцьцё адбылося. Адкрыцьцё краіны Беларусь.

Акт другі. Вайна. Па вайне край ляжаў у руінах. Засталіся адно аскабалкі й ад навукі. Не зьлічыць, колькі навукоўцаў загінула ў Галакосьце й на франтах, колькі не патрапіла ў статыстыку навукоўцаў з Заходняе Беларусі, колькі было незваротна страчана маладых сілаў на чужыне. На 1 студзеня 1945 г. у краіне было 583 навуковыя работнікі, зь іх 70 чалавек — з ступенямі.

Перад навукаю ў чарговы раз паставілі задачу. Сучаснай прамысловасьці «рэспублікі-партызанкі» патрэбныя былі найлепшыя інжынэры, тэхнолягі, канструктары.

Інтэлектуальны патэнцыял краіны рос звышдынамічна. Паводле сярэднегадавых тэмпаў фінансаваньня навукі й дасьледчых канструктарскіх работаў, паводле колькасьці працаўнікоў навукова-тэхнічнай сфэры Беларусь апярэджвала ўсе рэспублікі СССР! У 1955 г. у нас дзеяла 77 навуковых установаў, 28 зь іх — НДІ. У іх працавала 2629 навукоўцаў. Прыярытэтнымі сталі машынабудаваньне, радыёэлектроніка, а пасьля й вылічальная тэхніка. Стварыліся цэлыя галіновыя школы, што вызначалі навукова-тэхнічны прагрэс таго часу: фізікі цьвёрдага цела й оптыкі, паўправаднікоў і ядравай фізікі, кібэрнэтыкі, парашковай мэталюргіі, аўтаматызаваных сыстэмаў кіраваньня. У сярэдзіне 80-х у краіне налічвалася 167 навуковых установаў, у тым ліку 84 НДІ. Гэта была зорная старонка ў гісторыі навукі. Варта ганарыцца. Перагорнем і яе...

Беларусь стала суб'ектам міжнароднага права, атрымала шанец да паўнавартаснага незалежнага жыцьця. Але на гэтым выгіне гістарычнага шляху мэты тых, хто стаяў пры ўладзе, выявіліся няўцямнымі. Ставіць мэты перад нацыянальнай навукай не было каму. Самы каштоўны рэсурс, што стварыўся гэтак пакутліва, застаўся незапатрабаваны дзяржаваю. Сваёй, беларускай дзяржаваю.

Статыстыка бесстаронне засьведчыць трэці акт драмы беларускай навукі.*

За 12 гадоў зь беларускай навукі «сышлі» 77 тыс. чалавек, зь іх 40 тыс. дасьледчыкаў. Колькасьць навукоўцаў скарацілася больш як на дзьве траціны! Пазачыняліся НДІ, лябараторыі, канструктарскія й тэхналягічныя бюро. На вачах дэградавала ўся сфэра навуковае дзейнасьці. Напрадвесьні трэцяга тысячагодзьдзя, у 2000 г., на фінансаваньне праваахоўных органаў было выдаткавана 8% ад расходнай часткі бюджэту краіны, на навуку — 2,4% (у 70-я было 5%). Карціна не мяняецца й да сёньня. На гэтым тле плявузганьне рэжыму пра «захаваньне» навукі гучыць гэтаксама, як і сьцьверджаньні, што ён «дае» дождж. Але беларусы развучыліся сьмяяцца.

## Сенажаткі замест спадарожнікаў

Па-першае, навука Беларусі была часткаю навуковага комплексу СССР. У 1980-я блізу 80% усіх навукова-дасьледчых і дсьледна-тэхналягічных работаў выконваліся па дамовах з усесаюзнымі міністэрствамі й ведамствамі. Болей за 60% навуковага патэнцыялу Беларусі абслугоўвала савецкі навукова-прамысловы комплекс. З канцом СССР кончылася й тая навука.

Па-другое, пошукі «трэцяга» шляху фатальна зацягнуліся. У выніку эканамічнага крызысу нацыянальны бюджэт ня мае магчымасьці падтрымліваць забесьпячэньне навукова-тэхнічнага комплексу на належным узроўні. Сёньня работнікі масавых прафэсіяў атрымліваюць у 1,5 разу болей, чым інжынэры, і амаль удвая больш, чым кандыдаты навук. Траціна будынкаў, у якіх працуюць навукоўцы, мае знос на 60%. І 60% абсталяваньня, на якім яны ўсё яшчэ працуюць, старэйшыя за 15 гадоў! То бок беларуская навука засталася там, адкуль і выйшла. Далёка ў мінулым стагодзьдзі.

Па-трэцяе, пераход ад камуністычнай плянава-адміністрацыйнай эканомікі да зьмяшанай зьвёў на нішто актуальнасьць бальшыні папярэдніх навуковых дасьледаваньняў. Там, дзе, вобразна кажучы, стваралі касьмічныя спадарожнікі, цяпер паляпшаюць сенажаткі. Напрыклад, у 2002-м навукаёмістасьць валавога ўнутранага прадукту (ВУП) у Беларусі склала ўсяго 0,73%. Пры тым нават 1% уважаецца за крытычны. Каб краіна трапіла ў Эўразьвяз, гэты паказчык мае перавышаць 2%. Напрыклад, у Ізраілі ў 1996 г. ён быў 3,5%, у Швэцыі — 3,05%, у Японіі — 2,9%, у ЗША — 2,45%, Францыі — 2,38%, Вялікай Брытаніі — 2,19%, Індыі — 1,3%. У рэальных сумах гэта 170 млрд даляраў у ЗША, 75 — у Японіі, 9 — у Канадзе, 2,6 — у Расеі, у Фінляндыі — 2,02. Гэтак выдаткі на навуку з гакам акупляюцца вынікамі эканамічнай дзейнасьці.

## Прыклад падаў Платонаў

Куды ж падзеліся дзясяткі тысячаў навукоўцаў за гады незалежнасьці Беларусі? Умоўна падзелім іх на тры групы, за выняткам тых, хто даўно на пэнсіі ці ў лепшым сьвеце.

Да першай адносяцца найбольш сацыяльна актыўныя й унівэрсальна адукаваныя. Яны эмігруюць. Несупынна. У першую чаргу праграмісты, фізікі й хімікі, электроншчыкі ды біёлягі з матэматыкамі. У 1991—95 г. на сталае жыхарства за мяжу зьехала каля 300 навукоўцаў. Зь іх 26 дактароў і 114 кандыдатаў навук. Шокам для беларускай навукі стаў у 1992-м ад'езд у ЗША прэзыдэнта Акадэміі навук, сусьветна вядомага матэматыка Ўладзімера Платонава. За 1996—2002 г. зьехаў ажно 491 чалавек. Нарастае эміграцыя за мяжу зь беларускае правінцыі. Толькі ў 2002-м, толькі зь Віцебшчыны зьехалі 6 навуковых і 19 унівэрсытэцкіх работнікаў, 53 студэнты і асьпірант. Куды едуць? 38% — у ЗША, 32% — у Ізраіль, 10% — у Расею, 7% — у Нямеччыну, 3% — у Канаду. Бывай, мой родны край...

Другая катэгорыя, у адрозьненьне ад першай, парывае з навукаю. Гэта адмыслоўцы, якія з навуковых кабінэтаў пераехалі ў «вэртыкальныя». Многія пашыліся ў «палітолягі» ды «аналітыкі», спрабуючы хоць як абгрунтаваць беларускі палітычны абсурд.

Трэцяя катэгорыя самая паказальная. Гэта тыя фізікі й географы, мастацтвазнаўцы й матэматыкі, філёлягі й біёлягі, што занялiся «не сваёй» справаю — бізнэсам. Хтосьці, схаваўшы далей дыплём, ганяе на продаж іншамаркі ці будуе дамы. А нехта і вешае свой дыплём у рамачцы ў офісе.

У любым разе абедзьве апошнія катэгоры незваротна дэкваліфікуюцца. Яны страчаныя і для навукі наагул, і для беларускае будучыні ў прыватнасьці. А будучыня можа быць толькі адна: сур'ёзнай навукі ў Беларусі не застанецца наагул. Ды пры цяперашніх тэмпах эміграцыі, бадай, ня будзе й колішняе адукацыі... Апусьціце заслону! Запаліце сьвятло! Дзе апладысмэнты?

## Пад заслону

Ці магчымыя іншы сцэнары? Натуральна. Звычайны сцэнар, як і паўсюль: стварыць надзейны інвэстыцыйны клімат; вызначыць, якія напрамкі разьвіцьця могуць быць канкурэнтаздольнымі на сусьветным рынку; правесьці маркетынгавыя дасьледаваньні аб магчымасьці рэалізацыі навукова-тэхнічнай прадукцыі, створанай НДІ і СКБ краіны; зрабіць захады для абароны інтэлектуальнай уласнасьці; сканцэнтраваць сілы на невялікай колькасьці тэхналёгіяў, што могуць быць укаранёнымі й у айчынную вытворчасьць; знайсьці замежных партнэраў, якія б маглі дапамагчы ў дапрацоўцы і выкарыстаньні новых тэхналёгіяў; перайсьці да міжнародных сыстэмаў справаводзтва; правесьці рэструктурызацыю вытворчасьці й навукі, зыходзячы з умоваў рынкавага попыту і магчымасьці рэалізацыі прадукцыі, ды г.д. Але перадусім — навука зноў мусіць стаць самым прэстыжным родам людзкіх заняткаў у вачах нацыі. Неабходна вярнуць самакіраваньне Акадэміі навук, атачыць навукоўцаў усіх ступеняў пашанаю, вярнуць тыя нешматлікія прывілеі, што былі за саветамі, і падбаць пра новыя (хоць бы пра падатковыя) ільготы. Ці рэальна? Ня трэба апладысмэнтаў...Заслона.

**Гары Куманецкі**

* Тут і далей па тэксьце крыніца інфармацыі — «Развитие науки Беларуси в 2002 году (Аналитический доклад)». — Менск: БелІСА, 2003; выдадзены Камітэтам па навуцы і тэхналёгіях пры Радзе Міністраў.

# навукоўцы



## Заходняму працадаўцу няма розьніцы

**Супрацоўнік Інстытуту фізікі НАН, кандыдат фізыка-матэматычных навук Вячаслаў Шатохін месяц таму вярнуўся зь Нямеччыны, дзе два гады адпрацаваў у Інстытуце фізікі складаных сыстэмаў імя Макса Планка.**

**«НН»: Ці можна гаварыць аб перавабліваньні нашых навукоўцаў?**

**В.Ш.:** Заходняму працадаўцу няма розьніцы, якой нацыянальнасьці спэцыяліст. Галоўнае, каб чалавек, якога ён хоча наняць, быў спэцыялістам.

**«НН»: У якіх сфэрах найбольшы попыт на беларускіх навукоўцаў?**

**В.Ш.:** Я ведаю біёлягаў, хімікаў. Больш за ўсё фізыкаў, здаецца. Найменш гуманітароў.

**«НН»: Куды найболей зьяжджае нашых навукоўцаў?**

**В.Ш.:** У Нямеччыну. Там і грошай болей даюць на навуку, і ўзровень там вышэйшы, чым, скажам, у Швэцыі або Італіі. Саступае толькі амэрыканскаму і ангельскаму.

**«НН»: Дык што, каб таленавітая моладзь заставалася ў Беларусі, ёй трэба забараніць выяжджаць?**

**В.Ш.:** Калі не выпускаць, яна ня пойдзе ў навуку. У Нямеччыне таксама наракаюць, што найлепшыя галовы зьяжджаюць у ЗША. Прэзыдэнт Таварыства Макса Планка казаў пры мне наконт гэтага: «Калі чалавеку там ствараюць лепшыя ўмовы, ён мае права ехаць. Нашая задача — стварыць умовы тут. Калі мы ня можам гэтага зрабіць, дык ня маем права асуджаць чалавека за ягоны выбар». Раз амэрыканскаму прафэсару фізікі прапанавалі пасаду дырэктара Інстытуту фізікі цьвёрдага цела ў Штутгарце. Ён пайшоў у рэктарат свайго ўнівэрсытэту й сказаў, што атрымаў выгадную прапанову. У той самы дзень яму падвысілі заробак у некалькі разоў.

**«НН»: Эўрапейцы наракаюць на адток навуковых кадраў у ЗША. Выходзіць, што нашыя перяжджаюць на вызваленыя месцы?**

**В.Ш.:** Толькі часткова — тыя ж амэрыканцы едуць працаваць у Эўропу. Дый беларусы едуць і ў Аўстралію, і ў Новую Зэляндыю. Хаця лічыцца, што найлепшая навука — у Штатах.

**«НН»: Чаму?**

**В.Ш.:** Больш грошай на яе выдаткоўваецца. Больш магчымасьцяў для кар’ернага росту. Паглядзіце, колькі Нобэлеўскіх прэміяў атрымалі Штаты! Прычым большая частка ляўрэатаў нарадзілася па-за межамі ЗША.

**«НН»: Амэрыка «скупляе мазгі» па ўсім сьвеце…**

**В.Ш.:** Там разумеюць карысьць гэтага. У кампаніі IBM ёсьць дасьледчы аддзел, які займаецца фундамэнтальнай навукай. IBM укладае ў яго вялікія грошы і квітнее. Такія аддзелы маюць «Філіпс», «Сімэнс». Там дасьледуюцца квантавыя кампутары, напрыклад.

**«НН»: А наколькі магчыма запрасіць да нас замежнага спэцыяліста?**

**В.Ш.:** Вымагае вялікіх грошай. Прапанаваць давядзецца ня толькі заробак. Трэба, каб запрошаны мог наймаць сабе работнікаў, добра ім плаціць. У сто разоў больш грошай пойдзе на абсталяваньне...

**«НН»: У АН цяпер асноўны ўпор робіцца на праекты, што даюць вынік праз год-два. Як гэта адбіваецца на стане навукі?**

**В.Ш.:** Прыкладная навука накіраваная на задавальненьне патрэбаў прамысловасьці. І найхутчэйшае ўкараненьне яе распрацовак апраўданае. «Укараніць распрацоўкі» фундамэнтальнай навукі цягам трох гадоў нерэальна. Між тым у нас ёсьць цудоўна распрацаваныя фундамэнтальныя галіны, страціць якія будзе папросту злачынствам.

**«НН»: Напрыклад?**

**В.Ш.:** Выдатныя традыцыі мае Інстытут фізікі. На многіх кірунках — фізыка крышталёў, квантавая оптыка, лазэрная фізыка — дасьледаваньні вядуцца на сусьветным узроўні. Нашых навукоўцаў ахвотна запрашаюць чытаць лекцыі замежныя ўнівэрсытэты, працы й даклады друкуюцца ў заходніх часопісах. Закрываць такія дасьледаваньні — азначае цалкам ігнараваць тое, што дасягалася дзесяцігодзьдзямі.

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**

Краіны ЭЗ (Францыя, Швэцыя, Нямеччына) маюць гарантаваны працоўны мінімум заробку. У Швэцыі навуковец не атрымлівае менш за 12 тыс. кронаў у месяц (каля 1000 даляраў) безь зьняцьця падаткаў. Але наш кандыдат навук (у Швэцыі ён прыраўнаваны да доктара навук) мае там удвая болей. У Нямеччыне навуковец, які працуе ў прамысловасьці, зарабляе «брудныімі» 45 тыс. эўра ў год. У ЗША навуковец мае заробак ад 2500 даляраў у месяц (мінімум), а верхняе мяжы практычна няма.

Апошнім часам сярод беларускіх навукоўцаў сталі папулярнымі падзаробкі ў Польшчы: аклады там хоць і ніжэйшыя за заходнеэўрапейскія, але й кошт жыцьця не такі высокі. А заробкі атрымліваюцца ўсё адно вышэйшыя за беларускія.

# Навука на барыкадах



**Беларускія навукоўцы перажылі радыкальныя скарачэньні фінансаваньня моўчкі. Французкія ж пратэстуюць і пагражаюць эміграцыяй. Эўрапейская навука ўсё больш адстае ад амэрыканскай.**

Такога пратэсту ў Францыі яшчэ не было. Пяць тысяч дасьледчыкаў падпісалі інтэрнэт-пэтыцыю з патрабаваньнем выдаткаваць абяцанае фінансаваньне на навуку. Яны пагражаюць калектыўнымі адстаўкамі і выездам у ЗША, дзе зарабяць болей і будуць мець нармальныя ўмовы для працы.

### Амэрыка фінансуе Францыю

Прэзыдэнт Акадэміі навук прафэсар Эцьен Эміль Бальё, у лябараторыі якога ў інстытуце «Inserm» была створана славутая процізачаткавая пігулка RU-486, гаворыць у «Фігаро»: «Адкрыцьці, якія мы робім, фінансуюцца з амэрыканскіх прыватных крыніц». Дзяржаўныя сродкі складаюць мізэрную долю. Абсталяваньне лябараторый да таго састарэла, што прафэсару «сорамна прымаць замежных гасьцей».

Цяперашні парадак разьмеркаваньня дзяржсродкаў на навуку ў Францыі забюракратызаваны і да канца не зразумелы. Дзяржаўны цэнтар навуковых дасьледаваньняў (ДЦНД, адпаведнік нашай Акадэміі навук), які скардзіцца на нястачу сродкаў, два гады таму меў у запасе 500 млн эўра. Цяпер яны якраз сканчаюцца. Краіна выдаткоўвае на дасьледаваньні ўсяго 2% ВНП, а ЭЗ рэкамэндуе выдаткоўваць найменей 3%. Праўда, трымаюцца тае рэкамэндацыі толькі Фінляндыя і Швэцыя. Калі б Францыя захацела зрабіць гэта, дык рост яе выдаткаў на навуку павінен быў бы складаць па 10% штогод. Ніхто ў такі цуд ня верыць, хоць прэзыдэнт Жак Шырак і паабяцаў на Новы год, што да 2010 г. 3% будзе напэўна. «Яму лёгка абяцаць — ягоны тэрмін скончаецца ў 2007 г.», — іранізуюць навукоўцы.

### Асабліва ў інфармацыйных тэхналёгіях і біятэхналёгіі

«У Францыі дзяржава закінула фундамэнтальныя дасьледаваньні. Такая палітыка няўхільна прывядзе да занепаду і ўсіх прыкладных дасьледаваньняў», — гаворыцца ў пэтыцыі. Дасьледчыкам недаспадобы абмежаваньне конкурсаў на залічэньне ў штат ДЦНД (іх колькасьць павінна зьменшыцца на 10%). Больш, праўда, падпісваецца часовых кантрактаў на тры—пяць гадоў. Але «падрыхтоўка лябараторнай каманды для доўгатэрміновых дасьледаваньняў — гэта інвэстыцыя на дваццаць—трыццаць гадоў», — кажуць навукоўцы. Набор маладых дасьледчыкаў у «Inserm» скараціўся ўтрая. Лябараторыі «Авэнтыс» і «Пфіцэра» ў Францыі зачыніліся, а «іх дзейнасьць перанесеная туды, дзе балянс паміж фундамэнтальнымі і прыкладнымі дасьледаваньнямі падтрымліваецца, — у ЗША», — напісана ў пэтыцыі.

Тыднёвік «Тайм» у першапалосным артыкуле «Як Эўропа страціла сваіх навуковых зорак» высьвятляе прычыны. У 2000 г. у ЗША на навуку было выдаткавана 287 млрд эўра. У Эўропе — на 121 млрд менш. За акіянам працуюць 400 тыс. навукоўцаў з Эўропы. Толькі кожны восьмы думае вяртацца. «Нічога дзіўнага, што ЗША маюць на 78% больш патэнтаў у найноўшых галінах тэхналёгіі на кожнага жыхара, чым Эўропа, асабліва слабая ў сфэры IT і біятэхналёгіі», — піша «Тайм». У ЗША лічаць, што за адмовай ЭЗ пусьціць на свой рынак генэтычна мадыфікаваныя прадукты хаваецца й слабасьць эўрапейскіх вытворцаў. Гэты рынак належыць фірмам з ЗША.

### Навукоўцы як футбалісты

Група, якая займаецца дасьледаваньнямі раку ў Нью-Ёрскім унівэрсытэце мэдыцыны, складаецца з чатырох італьянцаў, двух французаў, немца і гішпанца, піша «Тайм». ЭЗ у мініятуры. Доктар Валерыё Дарэла з Нэапалю гаворыць, што ў Італіі зарабляў 900 эўра ў месяц. У Нью-Ёрку мае ўтрая больш. Другі італьянец, Мішэль Пагана, камэнтуе: «У футболе, калі ты зорка, цябе купляе іншы клюб. У ЗША можна выдатна займацца дасьледчыцкай працай». Навукоўцы падкрэсьліваюць: у ЗША іх адкрыцьці не прысвойваюцца прафэсарамі, што ў парадку рэчаў у Эўропе, укараняюцца прамысловасьцю, чаго на радзіме яны маглі б не дачакацца.

«Эканамічны рост будзе назірацца там, дзе ёсьць прамысловасьць, абапертая на сучасную навуку», — «Тайм» цытуе аналітыка Эндру Ўайклафа з Арганізацыі па эканамічным супрацоўніцтве і разьвіцьці. Шэф Эўракамісіі італьянец Рамана Продзі хоча зь бюджэту ЭЗ да 2007 г. выдаткоўваць на навуку дадаткова 8 млрд эўра штогод. І гэта да тых 17,5 млрд, што і так павінны быць патрачаныя на яе ў 2002—06 г. 8 млрд — гэта няпоўныя 0,07% зьвязаўскага ВНП! Але і такой сумы можа ня быць, калі па жаданьні Францыі, Германіі і Вялікай Брытаніі бюджэт Зьвязу будзе скарочаны да 1% ВНП краінаў ЭЗ. Тады палову яго зьесьць супольная аграпрамысловая палітыка. Падтрымліваць яе да 2013 г. пастанавіў Шырак, паколькі яна карысная французскім фэрмэрам, Эўропе ж яна дае перавытворчасьць сельгаспрадукцыі. Лішкі, моцна субсыдыяваныя, трапляюць на сусьветны рынак, што б’е па найбяднейшых краінах Афрыкі. Потым ЭЗ ім дапамагае, але робіць гэта ўжо зь іншай шуфлядкі ў супольнай касе... Урэшце выходзіць, што Брусэль выпраўляе тое, што сам псуе.

**Паводле «Gazety Wyborczej»**

# Бы

Нядзеля. Раніца. Стаю на прыпынку адзін. Сьнег замінае чытаць. Нават пад страху прыпыначнай інсталяцыі залятаюць сьняжынкі. Пад'яжджае трамвайчык. Пусты. Спыніўся, але дзьвярэй не адчыняе: «У ДЭПО». Чакае зялёнага сьвятлафора. Дачакаўся, дзынкнуў — мне? Выбачаецца? Я ўсьміхнуўся ў адказ. Вагончык пакаціў прэч. На заднім шкле сярод лядовых узораў нехта надрапаў BY. Як знак аўтамабіляў зь беларускай прапіскай. Ці гэта ад ангельскага «bye», ці ад нашага «byvaj»?

Успомнілася, як у газэце «Вабанк» надрукавалі артыкул. Нібы неўзабаве інтэрнэт-адрасы можна будзе пісаць і кірыліцай. Тады расейскія будуць «.ru» і «.ру», украінскія — «.ua» і «.уа». А як жа ж беларускія «.by», пытаецца аўтар артыкулу, — «.бы», ці «.бй», а можа, «.бай»? Сапраўды, цяжка прыдумаць тое, што існуе здаўна: «.by» = «.бы». Сымбаль «BY» — дакладна наш, беларускі. Ён выдатна нам пасуе. Самае беларускае слова — «бы». Самы беларускі лад — умоўны.

**Зьміцер Лапцёнак, Менск**

# Выпадак на вясельлі

**Мінула некалькі гадоў з таго часу, як у лепшы сьвет адышоў а.Уладзіслаў зь Вішнева. Памяць аб ім жыве ня толькі сярод вішнеўцаў, але і сярод усіх тых, хто калісьці бачыў гэтага ксяндза.**

Недзе ў годзе 97-м мне пашчасьціла наведаць Вішнева і нават пагутарыць з а.Чарняўскім. Найбольш цікавілі і зьбівалі з тропу яго пытаньні і кароткія рэзюмэ, у якіх дар прадбачаньня спалучаўся з рэдкім пачуцьцем гумару і трапным беларускім слоўцам.

Раз у вішнеўскі касьцёл зь вёскі прыехала вясельле. А.Уладзіслаў абвясьціў шлюб перад Богам. Маладыя ды іх госьці ўжо пачыналі зьбірацца да выхаду, калі ксёндз па сваёй звычцы стаў падыходзіць то да аднаго, то да другога з прысутных і зьвяртацца з характэрнымі дзіўнавата-таямнічымі пытаньнямі. Аднаго дзецюка ён чамусь спытаў: «Чым розьніцца сабака ад чалавека?»

Не счакаўшы адказу ў іншага, удакладніў: «Богу маліцца ўмееш? Што стаіш моўчкі, рукі на пузе склаўшы?» А агледзеўшы хлопца ў фацэтным белым касьцюме, наагул агучыў цікавую сэнтэнцыю: «Ну, і нашто ты апранаўся ў гэткае чыстае, белае? Увечары ж будзеш качацца ў брудзе як сьвіньня».

Слухалі ўсё гэтае людцы, добра знаёмыя з сваім сьвятаром і звыклыя да яго манераў. Ня надта зьдзівіўшыся, паўсьміхаўшыся і перажагнаўшыся на абразы, людзі выходзілі з касьцёлу, каб хутчэй перайсьці да больш прыемнай і зразумелай справы — застольля. Праз пару гадзін той самы хлопец, які нават сярод шлюбнага натоўпу выдзяляўся бялюткім гарнітурам, выйшаў з хаты і, хістаючыся, пашыбаваў на другі бок вулкі па невымоўна складанай траекторыі... I апынуўся ў вялізнай, пакінутай нядаўнім дождажыкам калюжыне — проста на вачох усёй вёскі.

Вось тут і ўзгадалі госьцейкі папярэджаньне а.Уладзіслава. I неяк сьмех, выкліканы калярытным кныром у лужыне, стаў сьціхаць. Людзі задумаліся, кожны аб сваім...

**Усевалад Сьцебурака, Менск**



# Разьмеркаваць маёмасьць сярод эліты

У чым сіла сучаснага заходняга сьвету? У кіраўнічай эліце, што ствараецца зь вельмі багатых людзей. Усталяваны лад жыцьця адпавядае іх інтарэсам, і гэты слой змагаецца за разьвіцьцё і выжываньне дзяржавы. У нас чалавек сёньня працуе дырэктарам, міністрам, дэпутатам, чыноўнікам — а заўтра ён пэнсіянэр і, значыць, ніхто. У сучаснага чыноўніка няма зацікаўленасьці не шкадуючы жыцьця бараніць, мацаваць усталяваны лад жыцьця. Эліта няўпэўненая, залежная ад выпадковасьці, ад валюнтарызму. Ня маючы ўласнага капіталу, яна вымушаная быць прадажнай.

Як стварыць кіраўнічую эліту, кроўна зацікаўленую ў існаваньні гэтай краіны, яе разьвіцьці і усталяваньні жыцьцёвага дабрабыту? Час імчыць, А.Р. ня вечны. Пакупнікі на нашу дзяржаву праз сваіх паслугачоў выпытваюць у А.Р., ці не зьбіраецца ён на трэці тэрмін. Ня церпіцца!

Вырашыць гэтае пытаньне можна праз акцыяналаваньне часткі дзяржаўнай маёмасьці і яе разьмеркаваньне ў першую чаргу сярод кіраўнічай эліты і часткі сярэдняй клясы. Гэтая справа павінна весьціся пад кантролем дзяржавы цягам 10—15 гадоў. Кожны сумленны чыноўнік, адпрацаваўшы на дзяржаву, будзе ведаць, што атрымае пакет акцый нейкага прадпрыемства пры выхадзе на пэнсію. Гэтаксама і перадавы рабочы, і вучоны, суддзя, вайсковец...

**Кастусь Травень**

НАЎЗДАГОН

# ТБМ не падпісвалася

**У апошнім нумары Вашай газэты надрукаваны матэрыял В.Заякоця «Дык не падпісвайся!».** Цытую: «Трусаў, далучыўшыся да «пяцёрачнікаў», падпісаў цэлы ТБМ — зьбірае ахвяраваньні на арэнду новага офісу».

ТБМ не далучалася і не зьбіраецца далучацца ні да якіх палітычных кааліцый ці блёкаў. Таму ад імя ТБМ я нічога не падпісваў і нават не прысутнічаў на прэзэнтацыі «Кааліцыі 5+».

Па-другое, я не зьбіраю грошы на арэнду ні старога, ні новага офісу.

Толькі недарэка не разумее таго, што высяленьне з Румянцава, 13 зьвязанае перш-наперш з нашай падтрымкай ліцэістаў.

**Алег Трусаў, старшыня Таварыства беларускай мовы**

# Па-першае, «БелПІ»...

**У мінулым нумары «НН» надрукавала інтэрвію зь Лявонам Вольскім. Мушу зрабіць некалькі ўдакладненьняў.**

Па-першае, фірма «БелПІ» не заказвала мне аніякага рэклямнага артыкулу. Напісаць пра крамбамбулю ў «Советскую Белоруссию» было маёю ініцыятываю, матэрыял рабіўся найперш для часопісу «Спадчына». Для «СБ» я наважыўся пісаць пад уражаньнем ад вёскі Жажэлка, дзе месяцоўца завод Дайнекаў, на якім і вырабляецца «Крамбамбуля». А нагодаю стаў запуск напою ў масавую вытворчасьць. Між спадарствам Дайнекамі а мною ніякіх спэцыяльных дамоваў, адпаведна й непаразуменьняў, не было й няма. Па-другое, артыкул напісаў Віктар Корбут, карэспандэнт аддзелу спэцыяльных праектаў «СБ», а ня нейкі Мухін. Так, працаваўшы на «Рацыі», я падпісваўся Мухіным, але каму рупіць, чаму тады я быў Мухіным, а цяпер стаў Корбутам, – хай папросіць, і я дашлю свой падрабязны радавод вышэй за пятае калена (спадзяюся, што наяўнасьць у маім беларускім балцкім генатыпе 25% паўночнарасейскае фінскае крыві не зьбянтэжыць пільнае публікі). Усе іншыя зьвесткі, якія Сьвятлана Курс перадала са словаў сп.Вольскага, пакідаю на ейным сумленьні. Чытачам раджу не даваряць беззаглядна газэтам, а мысьліць самастойна й крытычна.

**Віктар Корбут, журналіст «Советской Белоруссии»**

# Рэвалюцыя і Вандэя

**Адказ спадару Сержуку Пятровічу з Барысава**

У мэту майго артыкулу ўваходзіла ўшанаваньне памяці паважанай мной сьветлай постаці А.Адамовіча, а не падрабязны аналіз пытаньняў, зьвязаных з Францускай рэвалюцыяй і Вандэяй гістарычнай. Але паколькі сп.Пятровіч будуе свой адказ менавіта на апошнім, хочацца зьвярнуць увагу на некаторыя ягоныя фактычныя памылкі. Першае, Вандэя — дэпартамэнт правінцыі Пату, а не Брэтань. Другое — раялісцкі рух XVIII ст. ня мае нічога супольнага з брэтонскім нацыянальным адраджэньнем.

Пісаць пра рэвалюцыю заўсёды цяжка. Але разыкну выказаць сваё меркаваньне: Французкая рэвалюцыя 1789—94 г., нягледзячы на ўсе злачынствы і памылкі, сапраўды Вялікая. Да абвешчанай ёй Дэклярацыі правоў чалавека і грамадзяніна наступныя пакаленьні не змаглі дадаць нічога істотнага. Сярод іх было права нацый на самавызначэньне. I караля — гэта трэба памятаць асабліва некаторым дзеячам — пакаралі сьмерцю за нацыянальную здраду — запрашэньне ў краіну чужынцаў для «аднаўленьня канстытуцыйнага парадку».

Таму, называючы сябе дэмакратамі і патрыётамі, абаронцамі правоў чалавека (гэтыя словы таксама, дарэчы, ідуць з тых часоў), мы, сьвядома ці не, прызнаём сваю пераемнасьць з Рэвалюцыяй, а не з Вандэяй.

**Вацлаў Шаблінскі, Менск**

# Праўда Адамовіча

**У дні 10-годзьдзя з дня сьмерці Алеся Адамовіча хачу ўдакладніць недарэчнасьць чатырохгадовай даўнасьці, што зьявілася ў «НН» за 3 студзеня 2000 г. у нататках А.Глёбуса «Адамовічы».** Там А.Глёбус распавядаў пра трох беларусаў, пра трох Адамовічаў: Антона, Алеся, Славаміра.

Пра факты жыцьця кожнага чалавека, тым больш *вядомага*, трэба пісаць *дакладна*, у тым ліку і *пра ягоную сьмерць* — дзе і як яна адбылася. Тым больш што пра гэта пісала шмат якая прэса ў той час, ды і цяпер піша. *Толькі трэба было ўважліва чытаць аўтару нататкаў.*

Факталягічная памылка (?) у нататках А.Глёбуса — *Алесь Адамовіч памёр не на нейкім «урадавым банкеце» (на якіх, дарэчы, не бываў), а ў Вярхоўным Судзе РФ.* Адбылося гэта пасьля яго эмацыянальнай прамовы ў абарону непадзельнасьці маёмасных правоў Міжнароднага Літфонду, Саюзу пісьменьнікаў (туды былі ўкладзены грошы *ўсіх* пісьменьнікаў яшчэ ў часы СССР, але зьявіліся новыя жадаючыя стаць яго «новымі гаспадарамі».)

Думаю, ёсьць *вялікая розьніца* паміж Вярхоўным Судам і нейкім там «урадавым банкетам». З тых жа нататкаў чытач можа падумаць: раз банкет — мабыць, перапіў? I гэта пры тым, што мой тата зусім ня піў і пра гэта *ведалі ўсе*, але ў той час ён сам вельмі любіў частаваць, прымаць шматлікіх сяброў.

Яшчэ 21 сьнежня 1991 году мой тата перанёс цяжкі інфаркт, з таго часу ён праводзіў жыцьцё ў шпіталях, санаторыях. Але ён ня мог не пайсьці туды, куды пайшлі яго сябры-пісьменьнікі: Бакланаў, Чарнічэнка, Нуйкін, Акуджава, Анфінагенаў і іншыя, — *на тое паседжаньне Вярхоўнага Суду 26 студзеня 1994 году. Хуткая дапамога прыехала праз 1,5 гадзіны...*

А Адам Глёбус напісаў — «банкет»...

Хачу, каб чытачы паважанай газэты ведалі дакладную праўду, хаця б і празь дзесяць гадоў...

**Натальля Адамовіч**

# Лёнік і я

**Маё пакаленьне *зацікаўленых* ведае Вольскага ад першых сьвядомых дзён жыцьця.** Гэты чалавек так ці інакш паўстане ў дзіцячых успамінах недзе паміж сэнтымэнтальнай карцінкай паяданьня манкі з сочывам і першага асэнсаваньня музычных густаў. Ён — безумоўны лідэр нашага цеснага беларускага маленства, неаспрэчны аўтарытэт, чалавек, якому ўсе паверылі і якога палюбілі аддана, некрытычна і па-простаму. Лёніка называюць самародкам, выхаванцам сябе самога, які ўвасобіў даўнюю беларускую мрою... Даруйце, «Мрою».

Я памятаю той культавы па сваёй сьмеласьці і актуальнасьці часопіс «Бярозка», які пісаў пра сьпірытычныя сэансы і ананізм (тады гэта *на самрэч* было сьвежа), дзе зьмяшчаліся няякасныя постэры ўсесаюзных куміраў, калі з шурпатай паперы на мяне першы раз паглядзела нашая «Мроя» ў моцным грыме. I я пачала мроіць. Бел-чырвона-белай будучыняй, агучанай цёплым голасам яго высокасьці Лявона Артуравіча Вольскага. I не дзеля таго, што ў яго голас цёплы. А празь непаўторны бляск у вачох.

Свой крохкі і адначасова трывалы сьвет мы будавалі кожны сам сабе. Але Лёнік здолеў пакласьці свае «паветраныя шары» пасярод «бела-чырвоных дзён» у нашыя падмуркі. Ён захаваў стымул рабіць нешта, і хутчэй, і больш, «пакуль не пачнецца вайна». Ці пажар. Ці яшчэ трасца якая. Проста быць такім, як ён. Ці не такім. Толькі не як усе.

Летам 2002 году мы адпачывалі на лецішчы ў глухой і выключна маляўнічай мясьціне Бацькаўшчыны. Чутка пра магчымы прыезд Лёніка разбурыла ўсю ідылію. Мы выбігалі на сьвятло аўтамабільных фараў, кідаліся варыць каву, ледзь зачуўшы які вечаровы рух. Але Лёнік не прыехаў. Што характэрна для любога нармалёвага караля.

Вядома, ён ня самы таленавіты і ня самы разумны. Ён папсовы і далёка ня самы арыгінальны. Але ён сапраўдны і душэўны, ён беларускі і народны, ён зрабіў усё сам, ён геній і заслугоўвае, каб яго клікалі сапраўдным дзецюком.

Я веру гэтаму чалавеку, таму што ён верыць у нас. I люблю яго з тых самых прычын.

**Тэда Лі**

# Рэдзька і хрэн аднаго...

**Артыкул «Лабановіч прапануе падтрымаць Лукашэнку», а таксама выказваньні іншых палітыкаў («НН»№1'2004) уражваюць палітычнай сьлепатой.** Калі б спадар Лабановіч быў сапраўдным патрыётам, дык працаваў бы зь Зянонам Пазьняком, а не з расейскімі палітыканамі, якім Беларусь мроіцца як расейская губэрня. Хіба можа патрыёт сказаць такое: «Лепш Лукашэнка, чым Расея»? Як кажуць, рэдзька і хрэн аднаго смаку.

Сёньня ў нашай краіне два лідэры, якія стаяць на супрацьлеглых полюсах, — гэта паважаны дзяржаўны дзяяч Зянон Пазьняк і папуліст-прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка, што ўзурпаваў уладу ў краіне. Усе астатнія — гэта балота, якое засмоктвае тых, хто яшчэ пакуль на раздарожжы.

Сёньня кожны можа паставіць перад сабою толькі адно пытаньне: з кім я? З Пазьняком ці з Лукашэнкам? Тыя, што шукаюць трэці варыянт, працуюць толькі на згубу Беларусі.

**Афіцэр у адставцы Мікола Канаховіч, Пружаны**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць дописы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Конкурс для школьнікаў

**Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» абвяшчае конкурс сярод школьнікаў 12—14 гадоў.** Прысьвячаецца ён 490-годзьдзю бітвы пад Воршай і 210-годзьдзю паўстаньня Тадэвуша Касьцюшкі. Конкурс пройдзе ў дзьвюх намінацыях: мастацкія працы (малюнкі) і літаратурныя творы. Экспэртная камісія будзе разглядаць творы, якія адлюстроўваюць падзеі і лёс гістарычных асобаў (адной альбо некалькіх) нашай змагарнай мінуўшчыны і прысьвечаныя барацьбе беларусаў за волю і незалежнасьць Бацькаўшчыны з часоў Рагвалода і Рагнеды да XX ст.

На ўсіх працах мае быць пазначанае прозьвішча й імя аўтара, дата нараджэньня, зваротны адрас, па магчымасьці тэлефон. Дасылаць можна малюнкі памерам А3 (420х295) і А2 (420х590), а таксама літаратурныя творы (апавяданьні, вершы, сачыненьні, нарысы і інш.). Працы на конкурс прымаюцца да 20 красавіка. Адрас для дасылкі: МГА «ЗБС «Бацькаўшчына», вул.Рэвалюцыйная, 15, 220030, Менск. Даведкі праз т.: (017) 289-31-94.

Пераможцы атрымаюць каштоўныя падарункі.

**Знаўца**

# Карысны перапіс




**Дачакаліся мы нарэшце вынікаў агульнага перапісу насельніцтва Польшчы паводле гмінаў. Гэтыя вынікі няшмат новага ўносяць у тое, што мы больш-менш ведалі пра сябе. Усё ж такі даюць нагоду і для пэўных нечаканых высноваў.**

Пачну з чаканага. Цэнтар Беларушчыны там, дзе быў, — у Чыжах (81,81%). Толькі на волас адсталі ад Чыжоў Дубічы-Царкоўныя (81,33%). Досыць было б, каб у Дубіцкай гміне беларусамі запісалася на 10 чалавек больш, і яна зраўнялася б з Чыжоўскай. Такое становішча трывае ўжо стагодзьдзе, бо якраз жыхары гэтых гмін (Яўген Хлябцэвіч з Кленік, што ў гміне Чыжы, і Іван Краскоўскі з Дубіч-Царкоўных) заснавалі ў 1906 г. першую беларускую арганізацыю на Беласточчыне — бельскую арганізацыю Беларускай сацыялістычнай грамады.

На трэцім месцы — гміна Орля (68,93%), за ёй Гайнаўская-вясковая (64,91%).

Больш у ніводнай гміне працэнт беларусаў не перавысіў паловы. У некалькіх гмінах не хапіла няшмат. У Нарве (49,23%) да паловы ня стала ўсяго 36 чалавек. Крышку горш у Нараўцы (47,27%) і Бельскай-вясковай (46,68%) ды Кляшчэлях (41,83%).

Парог 20% перайшлі яшчэ толькі Чаромха (28,71%) і Гарадок (23,07%). Больш за 10% беларусаў у гмінах Нурац-Станцыя (16,36%), Міхалова (14,17%), Мілейчычы (13,09%) і Белавежа (11,54%).

Парог статыстычнай памылкі (3%) перайшлі беларусы ў гмінах Заблудаў (8,48%), Боцькі (8,11%), Шудзялава (4,86%), Мельнік (4,17%), Юхнавец-Касьцельны (3,95%), Супрасьль (3,22%) і Крынкі (3,20%).

Найбольш гарадзкіх беларусаў у Беластоку — 7434. Гэта ніжэй парогу статыстычнай памылкі (2,98%). Прызнаюся шчыра, я сам спадзяваўся, што беларусамі запішацца тут напалову менш людзей. Улічыўшы, што ў Беластоку пражывае каля 40 тыс. праваслаўных, беларусам запісаўся зь іх недзе кожны пяты.

У Гайнаўцы пражывае 5954 беларусы (26,41%). У Бельску — 5602 (20,66%). Улічыўшы, што ў Бельску прапорцыі праваслаўных і каталікоў больш-менш 55% да 45%, а ў Гайнаўцы недзе 66% да 34% (магчыма, трэба было б зрабіць праўку на карысьць праваслаўных), аказваецца, што беларусамі ў Гайнаўцы запісаліся 34—35% праваслаўных, а ў Бельску 31%. Нават калі дадаць 308 украінцаў, паказчык для Бельску будзе ніжэйшы, чым для Гайнаўкі, — 32,5% непалякаў сярод праваслаўных.

## На чыё пажаданьне прынялі на працу ўкраінскіх, а не беларускіх інструктараў культуры

Украінцамі палохалі нас дваццаць гадоў. Кожная просьба пра фінансавыя сродкі ці час на радыё і тэлебачаньні сканчаліся сакрамэнтальным адказам: а ў нас ёсьць яшчэ і украінцы, ім таксама належыцца, трэба дзяліцца (грашыма, часам і г.д). І дзе ж цяпер тыя ўкраінцы: у Беластоку 417 (плён дваццацігадовай працы архіяпіскапа Савы), у Бельску 308, у Гайнаўцы 103. Толькі ў Чаромсе ўкраінцы перасягнулі парог статыстычнай памылкі: 120 чалавек, або 3,14%. У Бельскай гміне, якой шмат гадоў кіраваў войт, актыўны ўкраінец, іх 94. Асабліва паказальныя вынікі ў гмінах Сямятыцкага павету. Беларускага руху ў некаторых гмінах амаль — а ў некаторых і зусім — не было. Нягледзячы на практычную адсутнасьць беларускай канкурэнцыі, украінцы не пераканалі ў цэлым Сямятыцкім павеце, са шматтысячным праваслаўным насельніцтвам, хаця б сотні чалавек. У Сямятычах цыганоў (ромаў) больш за тых украінцаў! Была ў нас і такая думка, што ўкраінцы нічога свайго ў нас ня створаць, але ж вельмі шмат шкодзяць, узбуджаючы сярод падляшан (палешукоў) сумненьні адносна сваёй нацыянальнасьці. Вынікі перапісу пярэчаць такой думцы. Не відаць прынцыповай розьніцы між тымі гмінамі, дзе ўкраінцы дзейнічалі, і тымі, дзе нічога не рабілі. Магчыма, паказчыкі для Бельску былі б крыху лепшымі, але напэўна ня лепшымі за Гайнаўку. Беларусаў сярод праваслаўных было б у Бельску, скажам, 34—35%, а не 31%. У Беластоку беларусы, магчыма, перайшлі б парог статыстычнай памылкі, але не сумняваюся, што беластоцкім уладам абсалютна абыякава, ці беларусаў у іхнім горадзе 2,55%, ці 3%. Усё-такі трэба запытацца войта гміны Дубічы-Царкоўныя, чаму арганізуе ўкраінскае, а не беларускае Купальле; і запытаць іншых войтаў, на чыё пажаданьне прынялі на працу ўкраінскіх, а не беларускіх інструктараў культуры.

З такой самай хуткасьцю, як сярод «падляшоў», а нават яшчэ хутчэй, і безь ніякай украінскай дапамогі, ішоў працэс палянізацыі сярод «ліцьвінаў». Можам зьдзекавацца з падляскіх украінцаў, што дваццаць гадоў малолі паветра, але і нам самім няма чым пахваліцца. У гмінах Белавежа і Міхалова, дзе праваслаўных, можа, і больш за палову, беларусы ледзь перасягнулі 10%. Нібы ў Вялікім Горадзе Беластоку жывуць, не на вёсцы. Скажам, у Белавежы Нацыянальны парк і столькі вучоных людзей з Польшчы тут панаехала, што прыгнялі тубыльцаў сваім інтэлектам. І турысты іх затапталі. Гміна Міхалова яшчэ пры Гераку, у семдзясятыя, выбраная была прафэсарам Наневічам (быў такі стратэг) як галоўны напрамак польскага «Культуркампфу». Беларускую мову зь ліцэю вывелі, пад вадасховішча вёскі адсялілі — і выйшла някепска.

Усё ж такі, чым растлумачыць наш правал у гміне Гарадок? Дзьве трацiны праваслаўных, традыцыі, выдатныя дзеячы, «Басовішча» — і ўсяго 23,07% беларусаў? Можна толькі суцяшацца, што, каб так не стараліся, было б у Гарадку беларусаў удвая менш.

## Можна запытаць гмінныя ўлады, што ў іх адбываецца

Даволі цікава параўнаць вынікі перапісу з «Даведкай аб навучаньні беларускай мовы ў школах Падляскага ваяводзтва» («Ніва» №47/2003). У школах у гмінах Чыжы і Дубічы-Царкоўныя працэнт вучняў, якія вывучаюць беларускую мову, вышэйшы за працэнт беларусаў сярод насельніцтва. Гэта сьведчыць аб павазе да сваіх нацыянальных карэнёў. У Гарадоцкай гміне адпаведны працэнт вучняў роўны (вышэйшы?) працэнту беларусаў. Ва ўсіх іншых гмінах і гарадах гэты працэнт нашмат ніжэйшы. У Нурцы-Станцыі, Міхалове, Мілейчычах і Белавежы, дзе працэнт беларусаў перавышае 10%, ніводзін вучань не вывучае беларускай мовы. У Чаромсе (напомню — амаль 29% беларусаў), на 272 вучні беларускую мову вывучаюць толькі 13. Можна крытыкаваць за гэта бацькоў, але можна запытаць і гмінныя ўлады, што ў іх адбываецца.

Ня маю пад рукой адпаведных зьвестак для Беластоку, Гайнаўкі і Бельску. Перад бацькамі гэтых 57 вучняў, якія вывучаюць беларускую мову ў Беластоку, можна толькі нізка пакланіцца. Адносна Гайнаўкі і Бельску з параўнаньня колькасьці беларусаў і колькасьці вучняў, якія вывучаюць беларускую мову, вынікае, што ў Бельску навучаньне беларускай мовы стаіць напалову лепш, як у Гайнаўцы.

Адносна веравызнаньня беларусаў можна сказаць адно: вынікі ясна паказваюць, што ў каталіцкіх гмінах беларусаў няма.

Калі ўжо гутарка пайшла пра «падляшоў» і «ліцьвінаў», дык вынікі перапісу дазваляюць сьцьвердзіць, што сярод беларусаў першых каля 75%; інакш кажучы, на трох «падляшоў» прыпадае адзін «ліцьвін».

## Пан міністар варочаецца ў труне

Наагул, вынікі перапісу для нас карысныя. У выпадку ўвядзеньня закону аб мовах меншасьцяў як дапаможных, павінен ён дзейнічаць на ўсёй тэрыторыі Гайнаўскага павету, гораду і гміны Бельск, гмін Орля і Гарадок (усё ж такі варта старацца), бо ў большасьці эўрапейскіх краін, у якіх дзейнічаюць падобныя законы, абавязвае парог 20%. Калі ўлады будуць літасьцівыя, дык яшчэ ў гмінах Нурэц-Станцыя, Міхалова, Мілейчычы і Белавежа. Дзякуючы перапісу, ніхто ўжо ня мае ніякіх падстаў, каб заяўляць, што няма ведама, якой, апрача польскай, мовай павінна тут карыстацца адміністрацыя. З пункту гледжаньня правоў меншасьці практычна неістотна, ці гэтай меншасьці больш за 20%, ці больш за 80%. Калі ўлады будуць неміласэрныя, дык і 100% будзе мала.

Беларускі масіў растае, але паволі. Нешта мяне ў сувязі з вынікамі перапісу так ня цешыць, як успамін пра міністра ўнутраных спраў Леапольда Скульскага, які на пачатку 20-х гадоў заявіў, што праз 50 гадоў усіх беларусаў пасадзіць на адной канапе. Прайшло гадоў восемдзесят, а беларусаў у Польшчы надалей тысяч пяцьдзясят. Якой трэба было б канапы! Пан міністар варочаецца ў труне.

**Алег Латышонак, «Ніва», Беласток**

## Бэрлінале

**54-ы кінафэст «Бэрлінале» пачаўся 5 лютага.** За «Залатога мядзьведзя», галоўны прыз Бэрлінскага фэстывалю, змагаюцца 23 карціны, у тым ліку 7 амэрыканскіх, 12 эўрапейскіх, па адной з Аргентыны, Паўднёвай Карэі й Ганконгу. Агулам жа на фэсьце пакажуць каля 400 карцінаў з 44 краінаў. Упершыню ў гісторыі фэсту фільмы конкурснай праграмы паказваюць ва ўсіх буйных кінатэатрах нямецкай сталіцы. Сярод найбольш імаверных прызэраў называюць стужку «Монстар» рэжысэркі Пэці Джэнкінс з Шарліз Тэран у галоўнай ролі прастытуткі-забойцы. Другі прэтэндэнт на прыз — вэстэрн «Зьніклая» Рона Говарда (аўтара «Гульняў розуму» і «Грынча — выкрадальніка Калядаў») з Томі Лі Джонсам і Лі Бланшэт у галоўных ролях: мэксыканска-амэрыканская мяжа пры канцы XIX ст., шмат індзейцаў і страляніны. Трэці прэтэндэнт — Патрыс Леконт з псыхалягічнай драмай «Блізкія незнаёмцы».



**Шарліз Тэран і Пэці Джэнкінс**

## Старадрукі на кампутары

**Нацыянальныя бібліятэкі Беларусі й Расеі пачалі супольны праект «Скарбы славянскай культуры».** На электронныя носьбіты занясуць поўны каталёг рэдкіх кніг і старадрукаў дзьвюх краінаў. Самыя каштоўныя выданьні будуць алічбаваныя цалкам. Каталёг будзе зьмешчаны ў Інтэрнэце й на асобных кампакт-дысках.

## Праваслаўныя сьпевы

**У Горадні адбываецца фэст праваслаўных песьнясьпеваў, у якім удзельнічаюць ня толькі царкоўныя, але й сьвецкія хоры.** Сярод амаль 40 калектываў ёсьць дзіцячыя хоры, хор сьвятароў, а таксама хор Варшаўска-Бельскай япархіі з Польшчы.

## Ня стала бацькі Папялушкі




**Джон Генч, адзін з «іміджмэйкераў» славутага Мікі Маўса, памёр 6 лютага ў Каліфорніі ў 95 гадоў.** Само Мышаня Мікі Ўолт Дыснэй прыдумаў у 1928 г., а Хенч на славутага мультыплікатара працаваў з 1939 г.: рабіў мультфільмы «Пітэр Пэн», «Папялушка» й інш., а таксама распрацоўваў ва ўсім сьвеце праекты славутых Дыснэйлэндаў — паркаў забаваў.

## Скафандар і «Рамаяна»

**Фільм па матывах раману клясыка саенс-фікшн Робэрта Гайнлайна «Have Spacesuit, Will Travel» пляную здымаць Дэвід Рэйналдз.** Раман апавядае пра падлетка, які выйграў у конкурсе касьмічны скафандар і скантактаваўся праз яго з зоркамі. Трылер у стылі навуковай фантастыкі па матывах індыйскага эпасу «Рамаяна» мае здымаць і адзін з галоўных індыйскіх кінавытворцаў Нітын Манмоган.

**AB; Gazeta.pl**



# Да 700-годзьдзя з дня нараджэньня Францэска Пэтраркі

Беларускі ПЭН-цэнтар

пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі журналістаў, газэтаў «Белорусская деловая газета», «Биржа информации», «Барысаўскія навіны», «Витебский курьер», «Вечерний Брест», «Вольны час», «Газета Слонімская», «Інтэкс-press», «Навінкі», «Народная воля», «Наша Ніва», «Наша слова», «Новы час», «Рэгіянальная газета», «Региональные ведомости», «Телевид-инфо», часопісаў «Arche», «Студэнцкая думка», «Дзеяслоў», «Мясцовы час», інтэрнэт-выданьняў «Літара.net», «Кнігі.com», «Дзед Талаш», «Пагоня.promedia.by»

**аб'яўляе творчы конкурс для маладых літаратараў:**

# Твор пра каханьне

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 22 гадоў (на момант абвяшчэньня конкурсу). Ляўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны сэмінар і майстар-клясы ў сталіцу, дзе перад імі выступяць знаныя пісьменьнікі, выкладчыкі ВНУ, вучоныя, сьпевакі, адбудзецца зацікаўленая гутарка аб творах маладых аўтараў і літаратурнай дзейнасьці.

На конкурс прымаюцца літаратурныя творы (вершы, апавяданьні, эсэ, п'есы, сцэнары, дзёньнікі і г.д.)

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпэлі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазьней за 15 сакавіка 2004 г. Падвядзеньне вынікаў першага туру адбудзецца 25 сакавіка. Літаратурны сэмінар пройдзе ў Менску 29 красавіка — 2 траўня.

Ляўрэаты леташняга конкурсу імя Натальлі Арсеньневай маюць права ўдзельнічаць і сёлета.

Журы конкурсу: Лявон Баршчэўскі (старшыня), Пятро Васючэнка, Ганна Кісьліцына, Міхась Скобла, Андрэй Хадановіч.

Творы дасылайце на адрас:
e-mail: pen@pen.unibel.by
Паштовы адрас: РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар», а/с 218, 220050 Менск.

Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 288-14-61.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА




# Люк Бэсон: прага маліны

Здаўна змагаліся паміж сабою на аўтамабільных трасах гоншчыцкая дынастыя Вальянаў і каманда «Чырвоны лідэр». Але ўдача, як правіла, не спрыяла апошняй. Помсьцячы за свайго бацьку, які заўсёды ведаў толькі горыч паразы, дачка — цяперашняя кіраўніца «Лідэраў» — вырашае ўзяць рэванш любой цаной…

Удосталь наздымаўшы аўтагонак па вуліцах Марсэлю ў камэдыйнай кінатрылёгіі «Таксі», Люк Бэсон вырашыў зрабіць «сур'ёзны фільм» на гэтую тэму. Праўда, рэжысурай мэтар даўно не займаецца, дык і пастаноўку стужкі «Мішэль Вальян: прага хуткасьці» ён даверыў Люі Паскалю-Кувэлеру, а сам узяўся за сцэнар. Пад рукой была грунтоўная першакрыніца — папулярны ў Францыі комікс пра непераможнага аўтагоншчыка. Але Бэсон палічыў за лепшае ўсю сюжэтную лінію прыдумаць самастойна. Відаць, дарма…

Бэсонаўскі фільм пра аўтагонкі цяжка не параўноўваць з апошнімі галівудзкімі напрацоўкамі на гэтую тэму — «Скрасьці за 60 сэкунд», «Фарсажам» і яго сыквэлам. Можна было чакаць, што французы прайграюць у якасьці і размаху камбінаваных здымак (так яно і адбылося), але, як ні дзіўна, нават немудрагелістая фабула амэрыканскіх стужак выглядае больш праўдападобнай і прапрацаванай, чым аповед пра Мішэля Вальяна. І «драйву», безь якога такія фільмы трацяць сэнс, у Бэсона і К° яўна недастаткова, каб кампэнсаваць слабасьць сцэнару.

**Іван Пятроў**

● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ ●

**Аўгустоўскі канал: Ад Віслы да Нёмана:** Фотаальбом / Уклад. А.Ласьмінскі; Аўт. уст. арт. І.Трусаў. — Менск, 2004. 3000 ас.

Сёньня Аўгустоўскі канал — гэта зарослыя, закінутыя берагі, над якімі лунае дух гісторыі. Здымкі, сабраныя ў альбоме, адлюстроўваюць сучасны заняпад і аскепкі ранейшае велічнасьці. Сапраўды, «ёсьць чары ў забытым, старадаўнім…».

**Нераток Ю. Фотаальбом**: Вершы. — Менск: Тэхнапрынт, 2003. — 80 с. 250 ас.

«Люблю цябе, народ мой памяркоўны, за твой працоўны сьверб і нораў роўны; … за звычку, што характар твой стварае: каб хатка між людзей, а хлеўчык з краю», — піша аўтар у вершы «Кплівае прызнаньне». Кніга, створаная ў цалкам традыцыйнай стылістыцы, поўная «сьпяваных-перасьпяваных» матываў нацыянальнай літаратуры, тым ня менш не ўспрымаецца як чарговы «плач» пакрыўджанага нацыяналіста. Аўтар знайшоў хісткі балянс паміж паэзіяй і публіцыстыкай ды даказаў, што клясычныя вершаскладальныя прыёмы ня страцілі сваёй плённасьці пры адлюстраваньні беларускае рэчаіснасьці.

**Славутыя імёны Бацькаўшчыны:** Зб. Вып. 2. / Уклад. У.Гілеп і інш.; Гал. рэд. А.Грыцкевіч. — Менск: БФК, 2003. — 384 с. 2000 ас.

Першы выпуск гэтай кнігі надзвычай хутка зьнік з паліцаў кнігарняў. Кампэтэнтны рэдактарскі калектыў на чале з Анатолем Грыцкевічам вяртае Бацькаўшчыне імёны яе герояў. У другім выпуску зьмешчаныя матэрыялы пра Міндоўга, Агінскага, Манюшку, Скірмунта і інш. Цана ў «Цэнтральнай кнігарні» 9760 руб.

**Белая книга:** Материалы мониторинга религиозной ситуации в Беларуси (август 2003—декабрь 2003) / Граждан. инициатива «За свободное вероисповедание»; Сост. Я.Басин. — Минск, 2004. — 370 с.

**Шпилевский П. Путешествие по Полесью и белорусскому краю** / Предисл., подгот. текстов С.Кузняевой. — Менск: Беларусь, 2004. — 251 с.: іл. 3000 ас.

З Варшавы — да Берасьця, празь Белавескую пушчу, палескія балоты, Кобрынь — да Нясьвіжу, Шчорсаў, а адтуль — на Менск і Барысаў ды Ігумен. Такі шлях прайшоў краязнаўца і этнограф Павал Шпілеўскі. Занатоўвалася ўсё: уражаньні ад дарогі, гутаркі з спадарожнікамі, асаблівасьці ляндшафтаў, апісаньні побыту, адзеньня, звычаяў мясцовага насельніцтва. Талент апавядальніка й назіральнасьць надалі запісам Шпілеўскага неацэнную пазнавальную каштоўнасьць. У «Акадэмкнізе» цана 9350 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**

КАЗКІ ЖЫЦЬЦЯ

Людка Сільнова

# Нашэсьце ледзяшоў

Яны прыйшлі да нас зь неба.

Зь нетраў далёкага космасу — на Зямлю, краіну. Раптоўна занялі, часова стаіўшыся на дахах і стрэхах, кожны горад, пасёлак, вёску.

Менск — сталіца і густа населеная выспа — за некалькі гадзінаў увесь пакрыўся цьвёрдым празрыстым рэчывам, якое ўвесь час вераломна ператваралася: цякучае і застылае, ілюзорна лёгкае і цяжкое, звыклае і незвычайнае...

Тыя зь людзей, у каго быў дар геройчнага бачаньня, адчулі Менск драконам, што ашчэрыўся крывымі мокрымі ледзяшамі-голкамі.

Тыя, хто ва ўсім бачыў прояву мастацкага мысьленьня Бога, прыпынялі крокі, спрабуючы пачуць музыку грандыёзнага аргана высокіх будынкаў у вэртыкальных трубках зь лёду.

Тыя, хто заўсёды глядзеў толькі пад ногі і выходзіў вонкі ў асноўным для таго, каб найхутчэй дабрацца да месца здабычы заробку, вымушаныя цяпер былі балянсаваць, як цыркачы, на адкрыта бессаромным лёдзе...

Дзеці вішчалі!

І ўсе — падалі, падалі, падалі.

Тыя, хто быў адказны пры камунальнай справе, ад каго залежала і хто сам быў залежны, падоўгу стаялі з тэчкамі на рагах асабліва небясьпечных будынкаў — і трывожна ўзіраліся ўверх.

Праз некалькі дзён прыхадні зь неба — сьлізкія заваёўнікі пачалі спускацца ніжэй. З гучным шоргатам ці, мяняючы тактыку, зусім бясшумна...

Па радыё папярэджвалі... Прыгожыя дыктаркі тэлевізіі адводзілі вочы, аб'яўляючы наступны драматычны сюжэт...

Вайна пачалася! Трэба адразу падкрэсьліць: для нас яна была абарончай. Як шкада! У ідэале сустрэча цывілізацыяў не павінна насіць заваёўнага характару.

На праезнай частцы — людзі, аўто, сабакі. Правілы цывілізацыі адменены! Змрочна падсьветленыя дамы трэба абыходзіць далей, каб ня трапіць пад ледзяшы, якія час ад часу атакуюць.

У Менску валадарыў Чужы. Нябачны напаўпразрысты Драпежнік, які, прасоўваючыся ў прасторы, рушыў дахі, ламаў галіны дрэваў, высьцілаў дол вуліцаў паваленымі людзьмі...

Неўзабаве на дахах сталі працаваць спэцыяльныя атрады ратавальнікаў-высотнікаў, замяніўшы першых добраахвотнікаў зь ліку легкадумных адзінак. Унізе разгарнулася барацьба з прымяненьнем мэтадаў хімічнае абароны: дзе змаглі, сыпалі соль, руды пясок, дзеці кідалі жуйкі... І вось...

Ледзяшы, крохкія як шкло, пры набліжэньні да зямлі давалі ператварыць сябе ў брудное месіва. Разам з падталым, цяжкім сьнегам і вулічным сьмецьцем гаспадарчыя машыны, у мігалках і агнях, пачалі вывозіць разьбітыя ледзяшы за горад.

Ня гэтым разам!



# Дзень Закаханых




Працоўныя суботы студзеня, якімі мы гераічна расплачваліся за тыднёвыя калядныя вакацыі, засталіся ззаду, і 14 лютага (суб.), на Дзень сьвятога Валянціна, закаханыя змогуць удосталь пабыць разам. Нечаканыя падарункі, вандроўкі, новыя кулінарныя знаходкі для сьвяточнай вячэры — 14 лютага магчыма ўсё.

Сярод беларускіх падзеяў дня вылучаецца канцэрт Віктара Шалкевіча з прээзэнтацыяй альбому «За сто крокаў ад Вострае Брамы, або Геаграфія ВКЛ і ваколіцаў», які пройдзе ў Палацы культуры вэтэранаў (вул. Янкі Купалы, 21). «Бацька беларускага бруднага блюзу» прыяжджае ў Менск, каб годна давесьці, што ягоную творчасьць рана здаваць у музычны архіў. Квіткі каштуюць 5—7 тыс. руб. Пачатак а 19-й. Т.: 649-08-88, 766-24-25.

У Валянцінаў дзень нават Мадлен Олбрайт была здольная падараваць кожнаму ўдзельніку паседжаньня Рады Бясьпекі ААН па мяшэчку цукерак. Маладафронтаўцы мяркуюць а 12-й сабраацца на пляцы Волі і ўрачыста, зь сыцяжкамі розных краінаў прайсьціся па заходніх пасольствах зь віншаваньнямі. Акцыя «Мы любім Беларусь!» плянуецца як выключна сьвяточная, аднак гарвыканкам яе не санкцыянаваў. Шэсьці й вечарыны 14-га ладзяць маладафронтаўцы трыццаці гарадоў Беларусі. Для каго палітыка, а для каго нагода пазнаёміцца зь беларускамоўным сябруком ці сяброўкаю.

А аматары савецкага спорту маюць шанец устаць на лыжы. З заклікам «Усе на лыжы!» зьвяртаюцца да менчукоў гарадзкія ўлады й Міністэрства спорту й турызму. Спартовае сьвята «Менская лыжня» пройдзе на лыжнай трасе ў раёне пр.Машэрава. Чакаецца, што гэтым разам на старт выйдуць каля 4 тыс. чалавек, у тым ліку й кіраўнікі дзяржавы і ўраду. Шоў будзе забясьпечанае. Калі, вядома, да таго часу застанецца сьнег.

А можна зьмяніць абстаноўку і адпачыць за горадам. Напрыклад, нарачанскія гатэлі на Дзень закаханых рыхтуюць спэцпраграму, у якой, праўда, нічога незвычайнага не прадугледжана: саўна, лазьня, басэйн, сьвяточны банкет, блінцы, шашлыкі. На тры дні і дзьве ночы за такую асалоду турапэратары возьмуць 95 тысяч з дваіх, уключаючы пераезд, але звычайна без уліку кошту харчаваньня. Два дні на прыродзе ў Раўбічах каштуюць 90 тысячаў, на «Высокім беразе» пад Стоўпцамі ці на Браслаўскіх азёрах — ад 80 тысячаў на дваіх.

## Салодкія валянцінкі

**Тым, хто шукае салодкі падарунак да Дня Закаханых, варта наведаць гомельскія цукерні.** Напярэдадні 14 лютага фабрыка «Спартак» выпрабляе тарты й слодычы ў форме сэрцаў ды «падарункавы» шакаляд. На фабрыку якраз запрасілі францускага кандытара, які шмат гадоў адпрацаваў у «Nestle».

## Чэмпіянат Эўропы па біятлёне



**18—22 лютага ў Алімпійскім спартовым комплексе «Раўбічы» (20 км ад Менску) пройдзе чэмпіянат Эўропы па біятлёне.** За кароткі тэрмін Раўбічы падфарбавалі й падчысьцілі. Збудаваная новая біятлённая траса шырынёю 6—8 м — цяпер спаборніцтвы можна будзе праводзіць і ўлетку. Арганізатары парупіліся пра ўладкаваньне аўтастаянак ды забесьпячэньне наведнікаў Раўбіч харчаваньнем.

## Для бухгальтараў

**Ад 12 да 14 лютага ў Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3) «Экспафорум» прапануе спэцыялізаваную выставу «Бухулік. Аўдыт. Бізнэс-Софт».** Заплянаваныя прээзэнтацыі фірмаў-удзельніцаў, «круглыя сталы», сэмінары. Пройдзе й II Беларускі конкурс праграмных прадуктаў бухгальтарскага й эканамічнага прызначэньня.

## Грамніцы

**15 лютага — праваслаўныя Грамніцы — сьвята «жывога агню», які ахоўвае чалавека ад ліхіх сілаў.** Шанаваньне агню з паганства перанеслася ў хрысьціянскую абраднасьць. На Грамніцы ідуць да царквы ды асьвячаюць васковыя сьвечкі. Грамнічныя сьвечкі цягам усяго году захоўваюць у хаце за абразамі. Запальваюць на вясельлях, на Дзяды, Каляды, Вялікдзень. Грамніцы — дзень многіх прыкметаў. «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы». Лета ў такім выпадку трэба чакаць непагоднага й неўрадлівага. Калі ж 15 лютага моцны мароз — сьнег паляжыць нядоўга, а лета будзе сухое й пагоднае. Мяцеліца на Стрэчаньне — на доўгую вясну. На Грамніцы можна пачынаць рыхтавацца да вясны. «Прыйшлі Грамніцы — здымай рукавіцы».



## Абноўлены «Нэйрадзюбель»

**15 лютага ў клюбе «NC» (вул.Кастрычніцкая, 17) выступіць гурт «Нэйрадзюбель», абноўлены на дзьве траціны.** Гітарыст быў звольнены з прычыны непавагі да калектыву, клявішнік займаецца сольнай праграмай, з прыватных прычынаў сышоў басіст Стась, пляменьнік Ядзьвігі Паплаўскай. Заміж іх прыйшлі новыя музыкі. Кулінковіч кажа, што заўзятыя. Будуць старыя гіты й новыя песьні. Пачатак а 18-й.



Аляксандар Кулінковіч

## Кнігі Беларусі

**17—19 лютага (аўт.—чацьв.) у Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» (Янкі Купалы, 27) пройдзе традыцыйная выстава-продаж «Кнігі Беларусі-2004».** Свае выданьні выстаўляць болей за 30 краінаў. Пагартаць ды набыць кніжныя навінкі можна будзе 17 лютага ад 13-й да 19-й, 18 і 19 лютага — ад 10-й да 19-й.

## Сярэднявечная дыскатэка

**19 лютага (чацьв.) у клюбе «Тунэль» (пр. Пушкіна, 28) пройдзе сярэднявечная дыскатэка з удзелам гурту «Старыя Ольса».** Калі маеце жаданьне патанчыць пад старадаўнюю музыку, паціць непастэрызаванага беларускага піва, пазнаёміцца з рыцарам або знайсьці даму сэрца — гэтая імпрэза для вас. Арганізатары вітаюць пераапрананьне ў сярэднявечныя строі. Пачатак а 19-й. Кошт квітка 6500 руб. Кожнаму наведніку абяцаны плякат з выявай «Старога Ольсы».

## АФІША

### Яўген Кулік

Да **16 лютага** Палац мастацтва (Казлова, 3) запрашае на выставу, прысьвечаную памяці Яўгена Куліка. Экспазыцыя зладжаная Саюзам мастакоў і суполкай «Пагоня». Т.: 213-44-68.

### Пераемнасьць

Да **14 лютага** ў лекцыйнай залі Нацыянальнай бібліятэкі (Чырвонаармейская, 9) праходзіць выстава акварэляў Фэлікса Гумэна ды Ўладзімера Рынкевіча — настаўніка й колішняга вучня. Уваход вольны. Т.: 226-18-40.

### Сямнаццаць зімаў

З **6 лютага** ў галерэі «Мастацтва» (пр. Скарыны, 12) адчыненая выстава Гаўрылы Вашчанкі «Сямнаццаць зімаў».

### Адчуваю скурай

Выстава карцінаў Вольгі Дзянісавай экспануецца ў галерэі «Славутыя майстры» да канца лютага. Т.: 283-28-25.

### Нацыянальны акадэмічны

**16 лютага** (пан.) купалаўцы паказваюць «К'ёджаўскія перабрэхі» (К.Гальдоні), камэдыю ў 2-х дзеях у пастаноўцы У.Шчэрбаня.

**18 лютага** (сер.) на Малой сцэне — «Салямэя» (С.Кавалёў), летапіс каханьня ў адной дзеі.

**19 лютага** (чацьв.) на Малой сцэне — монаспэктакль паводле кнігі Я.Баршчэўскага «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

### Музычныя вечары ў Пінску

У Пінску да **26 лютага** працягнецца X фэстываль «Лютаўскія музычныя вечары». Выступяць гітарысты зь Менску, інструмэнтальны ансамбль з Гомелю, пінскі камэрны хор і інш.

### Мулявін і Гусоўскі на Багдановіча

Музэй гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 15) прапануе выставы: «Студзеньская мэлёдыя камянёў», прысьвечаная творчасьці Ўладзімера Мулявіна, і «Мікола Гусоўскі. Голас XVI ст.». Выходны ў музэі ў панядзелак. Т.: 234-72-61

### Хараство ў камені

Да **15 лютага** (нядз.) працуе мінэралягічная выстава-ярмарка «Каменная казка». Пабачыць і прыдбаць мінэралы, ювэлірныя ўпрыгожаньні, каменярэзнае абсталяваньне, літаратуру можна ў галоўным корпусе БДУ (пр.Скарыны, 4) з 11 да 20 гадзінаў. Т.: 209-54-90.

## КІНААФІША

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Рэальнае каханьне» — **13 лютага** (пятн.) 16.20 18.40 21.00; **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 14.00, 16.20, 18.40, 21.00.

«Забіць Біла» — **13 лютага** (пятн.) 17.00 19.00 21.10; **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 15.00, 17.00, 19.00, 21.10.

Зборнік мультфільмаў (д.) — **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 12.30.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **13—15 лютага** (пятн.—нядз.) 16.00, 20.00.

«Дзеці шпіёнаў-3D: Гульня скончаная» — **13 лютага** (пятн.) 14.00; **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 12.00, 14.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Мішэль Вальян: прага хуткасьці» — **13 лютага** (пятн.) 14.50, 16.50, 18.50, 21.00; **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 14.30 (іл.), 16.40, 18.50.

«Другі бок ложка» — **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 21.00.

**«Масква»** (223-14-48)

«Мішэль Вальян: прага хуткасьці» — **13 лютага** (пятн.) 17.00, 19.00, 21.00; **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 14.30, 16.30.

«Дзюплекс» — **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 12.30 (іл.), 18.30, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Кепскія хлопцы-2» — **13—15 лютага** (пятн.—нядз.) 18.30, 21.00.

«Глыбіня» — **13 лютага** (пятн.) 17.30, 20.00.

«Лара Крофт — раскрадальніца грабніцаў-2: калыска жыцьця» — **13 лютага** (пятн.) 16.20; **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 14.00 (іл.), 16.20.

«Мужчына і жанчына» — **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 18.10.

«Бальная сукенка» (д.) — **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 15.00.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Летуценьнікі» — эксклюзіўны паказ фільму Б.Бэрталючы, **13—15 лютага** (пятн.—нядз.) 21.20.

«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **13 лютага** (пятн.) 14.20, 17.55; **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 14.20 (іл.), 17.55.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)

«Вельмі страшнае кіно-3» — **13—15 лютага** (пятн.—нядз.) 13.10, 17.10, 21.00.

«Анёлы Чарлі-2: Толькі наперад» — **13 лютага** (пятн.) 11.00, 15.00, 19.00; **14,15 лютага** (суб., нядз.) 11.00 (іл.), 15.00.

«Тарыф на месяцавае сьвятло» — **14, 15 лютага** (суб., нядз.) 19.00.

**Тацяна Вабішчэвіч, СБ, АШ**

# Юрась ПАЦЮПА


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Баляда вясны

Калі недавер асядае на сэрца карою,
згасаюць маланкі і ў небе ня струны — драты,
скіпаецца бэз мой іржаваю, брудней шумою
і тая жанчына... і тая напэўна ня ты.

Прад ёю ўсе словы гараць, як сарванае лісьце,
і мала паветра — так рыбе бракуе вады.
Яна любіць бэз, а я, не знаходзячы выйсьця,
адно магу крыкнуць: «Бывай назаўжды!»

Ну што табе бэз, як язьмін неўзабаве нахлыне,
адно не пазнаю, аб чым жа вяшчуе той пах.
Я, можа, ускрэсну аднойчы ў тваім успаміне,
як горыч ад кветкі, што ўсё яшчэ ёсьць на губах.

І мо недавер разьляціцца, як дым над зямлёю,
і яваю ўстане адзін за другім успамін,
і сьвігне маланка яшчэ паміж мной і табою,
і ўспомніцца бэз і зусім недасьпелы язьмін.

Ніколі ж ня ўспомнім, нашто мы сябе абкрадалі,
а бэз адцьвітаў спакваля безь цябе, безь мяне.
І раптам язьміну цяжкія і душныя хвалі
табе нагадаюць: так пахне жывое ў труне.

## Правінцыя

Правінцыйнае неба, дзе стрэхі кудысьці плывуць
і, як чайкі, паволі у грушавых хвалях зьнікаюць,
вецер сушыць і трэпле праз цэлае лета траву,
і зьвіваецца пыл, і ляціць, як сабака, клубкамі.

Сесьці, ехаць і раптам сысьці зь цягніка
у мястэчку, дзе сад і рассохлая скрыня-вэранда,
і дзе топаль, як студня, у глыбіні мацерыка
прагачыўся і з кроны шырока расплюхвае
радасьць.

Гэта ў цэнтры Эўропы гісторыя скончыла бег,
і лятуць цягнікі, і глядзяць на іх сьлівы з дакорам,
і пра тую вясну ўсё гадае запылены бэз,
і навек вінаград пераплёўся з драўляным дэкорам.

Тут ня стане чарніла табе для бясконцых паэм —
дык сьпівайся, бо ўвесь гэты сум апісаць немажліва.
Ты уздумаеш — вечнасьць і сад падасі як Эдэм?
— Кінь дурное і зьлётай у краму па піва!

## Багавейнасьць

Як добра празь вечнае лісьце ўзірацца туды,
дзе сонца заходзіць і птушак імклівыя цені,
дзе поўнае неба адбітай сьцюдзёнай вады,
дзе явар і хмель у благаньні схілілі калені.

* * *

Вечар, быццам у вадзе адлюстраваньне,
Разаб'ецца або толькі затрымціць.
Коні шыі лебядзіныя ў тумане
цягнуць: хочуць зоры порсткія лавіць.

І туга паўсюль аднолькава ў прасторы.
Дзе ні ступіш, як пячатка, дзіўны зрок.
Глянеш — ціха. Толькі лес, гарод, разоры
і вяргіняў дзікіх вараны жаўток.

А жыцьцё бялізнаю цьвіце на дроце
і буяе дзецьмі цішыня двароў.
Лета ягадай замкнулася у роце —
будзе час на перачытваньне лістоў.

Толькі конікі шчыруюць у малізе*,
толькі вострыцца пад ветрам асака...
Чуеш звон? Пара вячэраць і маліцца,
хай нальюць аблокі ў місу малака.

* * *

Даруй, мой Бог, маю няшчырую малітву,
яшчэ жыву, люблю і дыхаю яшчэ,
і трачу пакрысе сваю убогую лавітву,
і восень мне гарыць сьвятлом Тваіх вачэй.

* мэліса (рэг.)

## Вольга АНІКІЕВІЧ

* * *

Сонца на дарогах разьлівала стому,
вецер у абдымках калыхаў зямлю.
Неяк ненарокам я выходжу з дому
і цалую неба: я яго люблю.

Вір аблокаў сьнежных высьцеліў
пярыну,
адпачыць кладуся ў белыя мяхі.
Мне пушынак лёгкіх вецер зь неба
зрынуў,
каб магла сагрэцца я ў віры зімы.

Я пабачу сонца, сны свае сагрэю,
у нябесным люстры ўглядзеўшы
зямлю.
Я калаю зімку, я люблю завею,
я калаю неба, дзе салодка сплю.

## Андрэй ВАЛОШКА

* * *

Скацілася сонца за гоні,
Нябесны кісель загус.
Паўмесяц у жоўтай кароне
Прылёг на купальскі абрус.
Залотныя зоркі блішчалі,
Зьвінела сьвятло, як цьвікі, —
Празрыстыя млечныя далі
Па-над Беларусяй цяклі.

## Цемрык ВЕЛЕТ

* * *

Але, Кастусь, пайшлі пап'ём з
фальшывых танных кніжак.
Пазьдзекавацца можна, бо
голасу,
як твой,
ня мае кожны.
Трымайцеся, правадыры партрэтаў і
эцюдаў.
Усё нагамі дагары. Мы слухаем
і пасьвім
робін гудаў.

## Ян ДЗІВАСІЛ

### Ляля

Прыгожа ступіла
на сьцежку чаканьня
багіня вясны,
маладосьці, каханьня.

Здалёк яе ўбачыў
у белым убраньні
і радасна ўсклікнуў:
— О сьветлая пані!

Ударылі звонка
каменькі словаў
у жоўты крышталь
цішыні дзьмухаўцовай.

Сп'янелы
ад водару кветак салоўка
ачомаўся і
прывітаў сьпевамоўкай.

## Наста КУДАСАВА

* * *

Дзесьці хваляй блакітнаю бацька
Дняпро
Казыча пяскі Рагачова...
Зацугляць бы мне пару магутных
Вятроў
Сваім цьвёрдым радзіміцкім словам!
Хай лятуць, хай пяюць берагам
дарагім
Майго сэрца шчымлівыя песьні.
Можа, там я пазбаўлюся горкай тугі,
Можа, там мой спакой уваскрэсьне.

* * *

Я патрабую траўня! Спрэс ружовага,
З цукровымі аблокамі і юрам.
Я патрабую траўня пажыцьцёвага
І шчасьця пад пратэкцыяй Артура!

Штодня гукаю, як вар'ят, галёкаю
Ды пакрысе ў чаканьні дагараю.
І не дажыць мне да вясны далёкае,
Як да твайго ўзаемнага «Калаю!».

## Віялета ПАЧКОЎСКАЯ

### Апошняя ноч «нацдэма»

«Такія доўга не жывуць,
Такія гінуць ў маладосьці».

Вы й не спрабуеце заснуць —
Навошта? — сёньня ж прыйдуць
«госьці».
Пад'едзе чорны «варанок»,
Ды Вы й ня будзеце хавацца,
Бо ўжо ні просьбы, ні замок
Не дапамогуць Вам застацца.
Яны прыйдуць, абавязкова!
І цішу крокамі парушаць...
А маці — цёмная! — замовы
Ў куточку шэпча. Ў горле сушыць.
Старая лямпа копціць столь.
У пляшцы — недзе на паўшклянкі,
Ды алькаголь ня сьцішыць боль,
Калі... не дажывеш да ранку.
Не гвалтаўнік і не махляр,
І то ня Вы пакралі сонца,
Вы — Беларус, і тым, спадар,
Вы зацікавілі забойцаў.
Няма. За вокнамі сьвятлее.
Няма. Мацнее сэрца стук.
Няма. Запахла ўжо надзеяй.
Але... О, не! Не-е-е!..
Стук-стук-стук.

ТАКІЯ доўга не жывуць.
ТАКІХ забілі ў маладосьці.
Крыжы на сэрцах.
Курапаты.
Косьці.

* * *

Ялінка на ўзьлеску
чакае каляднага падарунку.
Жыць.

## Ірына ЦІШКЕВІЧ

* * *

Ці маю права пісаць,
Думаць і дыхаць міма?
А час вымагае чакаць
Апошняга ўздыху Радзімы.

Мне кажуць: мастацкі вобраз
Шукай, нараджай, ствары...
Лёс выструніўся, як кобра,
І б'е бязьлітасна Край.

Глухая, з разьбітым тварам,
Згубіўшы сьляды дзядоў,
Асьлеплая ад пажараў,
Іду да цябе, Любоў.

За што і каму я вінная?
А час, нібы той ганчар,
Круціць, таўчэ мяне глінаю
І босую ставіць на жар.


ВІТАЛЬ ГІЛЬ «Г»

Барысік Таццяна

# Каханьне ў нашым кусьце

вясковыя сытуацыі*

## Жадаю вам

Добры дзень, паважаная рэдакцыя! Вашу праграму слухаю даўно, а вось напісаць адважылася ўпершыню. Сучасная моладзь часта скардзіцца на адсутнасьць матэрыяльнага дабрабыту й шчасьця ў асабістым жыцьці. А я вам вось што скажу: кожны сам гаспадар сваёй долі.

Ужо дваццаць пяць гадоў жыве ў вёсцы Вялікія Пацукі цудоўная сям'я — Вера Сямёнаўна і Сьцяпан Данілавіч Казулічы. У гэтых людзей можна шмат чаму павучыцца: жыцьцёвай стойкасьці, непераможнаму аптымізму, каханьню, пранесенаму праз гады цяжкіх выпрабаваньняў. А найперш — здольнасьці будаваць уласны лёс.

Ужо на што лахудрай урадзілася Вера Сямёнаўна — ні тварам, ні розумам, ногі самыя крывыя ў сельсавеце, — а вось жа сустрэла на сваім шляху другую палавінку. Сьцяпан Данілавіч застаўся ў вёсцы пасьля вольнага пасяленьня. За прыкладныя паводзіны атрымаў датэрміновае вызваленьне. Працавіты, чулы, уважлівы чалавек. Калі бывае цьвярозы, з ахвотай корпаецца ў градах, ходзіць у калгас на палявыя работы. Жонка завіхаецца па гаспадарцы. Да баптыстаў прыладзілася, зрэдзьчас наведвае малітоўны дом, адтуль цягне гуманітарныя транты. Так што купляць адзежу ў краме ня трэба.

У сям'і пяцёра дзетак. Хоць грашовая дапамога на іх невялікая, але ўсё ж такі капейчына ў дом. Двое старэйшых ужо пайшлі на свой хлеб. Вова адседзеў тры гады. Цяпер ляжыць у абласной псыхбольніцы — інваліднасьць зрабіць сабе хоча. Марынка, матульчына радасьць і надзея, робіць на БАМе цялятніцай. Грошы плаціць рэдка й мала, затое штодня мае торбу камбікорму. Замуж сабралася, у чацьверты раз. Малодшыя — Наста, Сярожа і Андрэйка — ходзяць у школу. Там іх бясплатна кормяць двойчы на дзень, як малазабясьпечаных. Бацькі з малых не нацешацца. Вучацца дзеткі абы-як, але здаровенькія і апэтыт добры.

У сям'і пануе каханьне, узаемаразуменьне ды згода. А калі нават пабʼюцца ці нажамі парэжуцца — з кім не бывае? Дык ужо назаўтра пахмеляцца, памірацца й шпацыруюць па вуліцы ў абдымачку.

Маці, бацька й меншыя дзеці разам у будні й сьвяты. У дзень палучкі ўпяцёх ідуць у кантору. Потым — у краму па віно й цукеркі.

Здараецца, хтосьці зь вяскоўцаў запросіць Казулічаў жаць жыта, капаць картоплю. Вера Сямёнаўна абавязкова бярэ з сабой дзяцей, каб змалку да працы прывыкалі. Бацькі робяць, малыя побач бегаюць. Пасьля гаспадыня кліча на бяседу.

— Цёця сёньня ўсіх частуе! — радасна абвяшчае маці.

Наста, Сярожа і Андрэйка навыперадкі бягуць да стала. Спрытныя, халеры, пасьпяваюць ня толькі наесьціся ўволю, але й тое-сёе з хаты вынесьці.

— Ну й дзеці ў цябе, Вера, не ўкарміць! — шчыра дзівіцца гаспадыня, выпраўляючы Казулічаў дадому. Нехта з гасьцей цішком прамаўляе:

— Бач ты, пʼюць, бʼюцца, зімой пад плотам валяюцца, дзеці расхрыстаныя й мурзатыя. І ніякая трасца не бярэ гэтых недаробкаў!

Добра, што не бярэ. Сам Бог ахоўвае іх сямейнае шчасьце й здаровейка. Бо менавіта на такіх людзях і трымаецца вёска.

Дарагія Вера Сямёнаўна й Сьцяпан Данілавіч, жадаю вам жыць доўга-доўга, дачакацца паболей унукаў і праўнукаў. А ў якасьці музычнага падарунка папрашу ўключыць у праграму песьню Ларысы Долінай пра пагоду ў нашай хаце.

## Тэлегісторыя

Каханьне, мае даражэнькія, — рэч сур'ёзная. Гэта вам ня сьмешачкі. Праз нешчасьлівае каханьне некаторыя нават вар'яцеюць ці сьпіваюцца. Зрэшты, вар'яцтва Тамары не пагражала. Яна й так была, як кажуць, пыльным мехам пацопаная. Жыла сабе спакойна ў вёсцы Каменцы, усё адно якога раёну. У кожным раёне ёсьць свая Каменка. А ў кожнай вялікай вёсцы — дзеўчына з дыягназам, ад родных брата й сястры народжаная. Але ня кожная дуркаватая мела такую прыбытковую працу, як Томка. Цётка ўладзіла яе пасудамыйкай у гарадзкую больніцу. Заробкі на вясковыя меркі неблагія. Уга — паўтары стаўкі ды дваццаць пяць адсоткаў прэміі! Да таго ж, на кухні заўсёды можна пад'есьці, што таксама важна. Асабліва для Томы, якая з маленства ела як не ў сябе, і цяперака ўкарміць дачку для маці было вялікай праблемай.

Кожную раніцу Тамара, апранутая ў сінія спартовыя штаны, белую кашулю (а ў сьвяты — з гальштукам-матыльком), сядала ў аўтобус і ехала на любімую працу. Увечары вярталася з батонам, катлетамі й двухлітровай бутэлькай кампоту.

Дома клалася на канапу, спажывала булку ці яшчэ што там з работы прывезла, глядзела тэлевізар. Аднойчы, пераключаючы каналы ў сваёй скрыньцы, натрапіла на праграму абласнога тэлебачаньня. І тут на блакітным экране Томка ўпершыню ўбачыла Яе — вядучую віншавальнай праграмы Вольгу П. Убачыла й закахалася. Як прозьвішча вядучай? А вам навошта? Таксама закахацца хочаце? Ды ў яе й так ужо тузін вар'ятаў закаханы. А Вользе ад гэтага ні горача не халодна: работа ў чалавека такая.

Для Тамары ж прагляд «Сьвята ў вашым доме» стаў сэнсам жыцьця. За два месяцы яна вывучыла прыпевы ўсіх песень. Зрабіць гэта нават разумова адсталай было нескладана: песьні перадавалі з дня ў дзень адны й тыя ж. Насамрэч, што можа быць лепей, чым ляжаць на канапе, спажываць дармавы батон, слухаць гарадзкую музыку й пазіраць на сваю каханую.

Пасьля пачаліся тэлефанаваньні на тэлебачаньне, лісты з процьмай артаграфічных памылак. Толькі вядучая размаўляць не жадала, на лісты не адказвала. Тады Тома вырашыла даслаць ёй падарунак. Але як? У райцэнтры на карпункце абласнога тэлебачаньня пасылку чамусьці не прынялі. Давялося самой каробку мармэляды зьесьці.

Тым часам у Каменку прыслалі маладых настаўніц. Томка пазнаёмілася зь імі ў аўтобусе, напрасілася ў госьці. А як даведалася, што адна зь дзяўчат — з абласнога цэнтру, пачала прыходзіць штодня. Распытвала, ці прыгожы будынак студыі тэлебачаньня, ці не бачылі яны Вольгу П., прасіла перадаць падарунак. Дзяўчаты сумавалі ў вёсцы. У першыя часы Томчына балбатня іх забаўляла. Да таго ж Тамара прыносіла з сабою магнітафон. А за гэта, пагадзіцеся, можна шмат прабачыць. У госьці заходзілі хлопцы з закускай і выпіўкай, перападала й Томачцы.

Пакрысе сьветлы вобраз вядучай адыходзіў на другі плян. Тома рэгулярна дасьцёбывалася да настаўніц, а адной зь іх нават прапанавала стварыць сям'ю, але тая праз сваю маладосьць і легкадумнасьць прапановы не ацаніла.

Неўзабаве дзяўчаты зьехалі з Каменкі, так і не перадаўшы пасылкі Вользе П.

За гэты час Тома прызвычаілася цягацца па хатах і кампаставаць людзям глузды расповедамі аб няспраўджаным шчасьці. Асаблівым стымулам для шчырага плявузганьня стала выпітая чарка.

Толькі цяпер ужо ніхто неналіваў. У калгасе не плацілі заробку, маці вытрасала з кішэняў астатнія рублі. Грошай на гарэлку ды новы падарунак для Вольгі не ставала. Вар'яцець далей ужо няма куды. Сыпцца праз нешчасьлівае каханьне ніякай магчымасьці. Гора.



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Пра любоў й «Дружбу»

За трыма лясамі, за трыма ўзгоркамі й трыма канавамі на ўскрайку невялічкай вёсачкі жыў чалавек. І была ў яго карова зь мянушкай Малюта. Чалавек вельмі любіў сваю карову й ганарыўся ёю. Як жа — такая тлустая, гладкая рабая! А малака давала на зайздрасьць суседзям — аж па пятнаццаць літраў у дзень!

Штораніцы гаспадар навязваў Малюту на паплоўчыку, штовечар размочваў у даёнцы бохан хлеба. Купляў крадзены камбікорм ажно ў саміх Асіповічах! Карацей, насіўся з сваёй каровай як дурань зь пісанаю торбай і быў шчасьлівы сваім клопатам. Малюта адзячвала шчодра: спраўна даілася, паслухмяна скубла траўку, не рабіла ў хляве ніякае шкоды.

Ні раней, ні пазьней мне не даводзілася бачыць такой любасьці й паразуменьня паміж чалавекам і жывёлінай. Сапраўднае ўзаемнае каханьне — моцнае, выпрабаванае часам, вольнае ад усялякай рэўнасьці. Але ў гэтыя чыстыя ўзаемаадносіны дваіх нечакана ўмяшаўся трэці.

І не абы-хто, а вядомы ў раёне чалавек — старшыня калгасу. Ён загадаў разараць паплоўчык. Цяпер гаспадару не было дзе пасьвіць рабенькую Малюту.

Сьветлай верасьнёвай ранічкай карова пакорліва выйшла з хлява ўсьлед за гаспадаром. Падымаючыся ў кузаў грузавіка, яна прадчувала нядобрае, зь вялікіх вільготных вачэй жывёлы беглі сьлёзы...

Каханьне, як звычайна, скончылася здрадай, продажам другой палавінкі дзеля ўласнага спакою. Гаспадар здаў Малюту на мяса, а на атрыманыя грошы купіў бэнзапілу «Дружба», рэч у гаспадарцы патрэбную.

А вы што, чакалі нечага іншага?

* Куст — аб'яднаньне некалькіх сельсаветаў у межах аднаго раёну.

# 2500 за Валета

**Аляксей Дудараў** адстойвае аўтарскія правы ў судзе. Ён дамагаецца, каб «Беларусьфільм» выплаціў яму 2500 даляраў за камэрцыйнае выкарыстаньне фільму «Белыя Росы». Аргумэнт кінастудыі: да 1996 году, калі набыў моц закон аб аўтарскім праве, былі зьнятыя тысячы фільмаў. Што ж будзе, мауляў, калі ўсе аўтары запатрабуюць ганарараў? Чыста савецкі адказ на цывілізацыйнае пытаньне.

# Выбарам далі «Грэмі»

**Біл Клінтан** і **Міхаіл Гарбачоў** атрымалі музычную прэмію «Грэмі» за ўдзел у агучваньні казкі Пракоф'ева «Пеця і воўк» на новы кшталт. Сёлета «Грэмі» было надзвычай запалітызаванае. Нават r'n'b-сьпявачка Бэянс Ноўлес, якая ўзяла аж пяць залатых грамафончыкаў і мусіла б быць галоўнай гераіняй, апынулася ў цені хутких прэзыдэнцкіх выбараў у ЗША. Гурт «Coldplay» прысьвяціў сваю песьню «Clocks» (найлепшы сынгл 2003 году) Джону Керы, Джордж Буш даў спэцыяльную ўзнагароду гурту «The Beatles». Гілары Клінтан намінавалася ў катэгорыі «найлепшы альбом» з гукавой вэрсіяй свайго бэстсэлеру «Living History», але «Грэмі» не атрымала. Хопіць і аднаго грамафона ў сям'і.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Не гадуйце бэнгальскіх тыграў

**Майк Тайсан** прызнаны банкрутам. Набыцьцё дарагіх машынаў і бэнгальскіх тыграў, развод з жонкай, якая адсудзіла сабе і дзецям два Тайсанавы дамы, а найбольш — суды, суды й суды ў справах згвалтаваньня, абразаў, боек, міталягічнага ўжо вуха Голіфілда зьелі ганарары Майка. Сёньня баксэр мае 150 тыс. даляраў і вінен 14,5 млн. Адваявацъ усё адным хукам, чарговы раз «вярнуўшыся» на рынг, жалезны Майк наўрад ці здолее. Яму 37 гадоў. І вобраз «найгоршага чалавека на зямлі» ўжо не ратуе. Дзе цяпер іміджмэйкеры, якія яго стваралі? Дзе ты, хуткаплынная спартовая слава?

# Мікрафон уласьці

## цытатнік

**Запісана на сустрэчах дэпутата і кіраўніцтва райвыканкаму зь вяскоўцамі**

Папрашу правесьці ўстрэчу і вапросы без эмоцый. А мы папробуем даць це ілі іныя атветы.

Шэпт у залі:
— Адгул за тое, што мы сюды прыперліся, сапраўды дадуць ці падмануць?

Паддзержыця вы меня ілі нет, мне безразьлічна. Усё раўно дзепутатам я буду!

З калхозьнікамі прошчэ разгаварываць, чэм зь бюджэтнікамі. Ані вапшчэ нікакіх дзенег не палучают. І я не віжу ў зале ні аднаво худова, ізмаждзённава чалавека.

Сейчас я дастану са сваіх шырокіх штанін усе вашы пісьма.

Нічаво не зьдзелалі, а ешчо бубніце.

Сьцябаць усіх дрынам, каб аж гай шумеў!

Лучшэ не будзет, будзет толька хужа. Паэтаму нам усім умесьце нада зацянуць патужэ пояс і начынаць работаць.

Вот, гаварат, дарогі плахія. Ня ўсё сразу. Зато какую ферму мы для вас пастроілі!

Пытаньне з залі:
— Чаму грамадзяне 1927 году нараджэньня не прызнаны ўдзельнікамі ВАВ?
— Вы дажылі да дваццаць першага века і ешчо чаво-та хаціце?

— Дакуль прыгон будзе? Няможна ўзяць у сельсавеце спраўкі, каб у горадзе малако прадаваць!
— Вы так гаварыце, патаму што завідуеце.

Старая бабка з залі:
— Ходзяць чуткі, што за сьвет ня толькі бедныя, а і багатыя ня плоцяць. Дык ці праўда гэта?
— Чуткі, плёткі! Давайце я вам лучшэ анекдот раскажу.

Ва ўсём вінаваты эці паразіты, каторыя самавольна к трубе падключыліся.

Адзін з кіраўнікоў аб стане водаправоду:
— Там, как гаварыцца, і сабака не валяўся! Так вы не паверыце, таварышчы, там дажа і каты валяліся!

Тэлеглядач дзеліцца ўражаньнямі аб праглядзе сустрэчы з дэпутатам:
— Народу — поўны клуб, і ён там нешта круціцца, фуфло кукурузнае. Заварушыліся!

**Запісала Тацяна Барысік**

Людка Сільнова



# SMS

Гарэлі зоркі ў вышыні —
Згаралі ў прывідным агні.
А ты ў Паўночны край паехаў,
Не адгукаешся ані.

Шлю SMS у далячынь:
«Сумуюць Прыпяць і Гарынь!
І без арла няма Эдэму.
Эдэм быў поўны толькі зь ім...»

Гарэлі зоркі ў вышыні...
Судзіць? Ды Божа барані!
Ляцець на сьветлае, сьвятое —
Хіба ня мэта ў нашы дні?

І ўсё мне бачыцца здалёк:
Разводзіць крылцы матылёк...
Разводзіць крылцы матылёк...
Разводзіць крылцы матылёк...

Шаноўнае спадарства!
Запрашаем Вас на спатканьне па тэме **«Хрысьціянская дэмакратыя ў Беларусі»**, якое пройдзе **14 лютага** (субота) а 16-й у Віцебску па вул.Герцэна, 10/7; 15-га а 15-й у Наваполацку; 21-га а 16-й у Гомелі па вул.Палескай, 52; 28-га а 16-й ў Магілёве (т.22-63-19).
Падчас сустрэчы закрануцца: погляд Цэркваў на месца чалавека ў грамадзтве і наш удзел ў палітычным жыцьці, гісторыя Хрысьціянскай дэмакратычнай злучнасьці і Праваслаўнага беларускага дэмакратычнага аб'яднаньня. Кожны ўдзельнік атрымае тэматычную брашуру!
Даведкі і рэгістрацыя: 8-029-699-33-01, http://CHDZ.by.ru

**17 лютага 2004 г.**

# «Напачатку была Песьня»



**Вечарына-прэзэнтацыя аднайменнага кампакт-дыску і новай кнігі вершаў Эдуарда Акуліна «Непрычалены човен».**

У імпрэзе бяруць удзел: народны паэт Беларусі Н.Гілевіч, А.Вярцінскі, В.Іпатава, У.Арлоў, Л.Дранько-Майсюк, А.Пашкевіч, М.Скобла, Р.Сітніца, А.Камоцкі, К.Герашчанка, Л.Тышкевіч і іншыя вядомыя беларускія паэты і барды.

Ласкава запрашаем усіх прыхільнікаў айчыннай паэтычна-песеннай творчасьці. Пачатак — 18.30. Дом літаратара (вул.Фрунзэ, 5). Уваход вольны.

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Кацю Межавец** віншую з Днём народзінаў. Шаную, сапраўды. Дрэнны чалавек Pilecki

**Дарагую бабулю**, маці Лідзію віншуем з 73-годзьдзем. Моцнага здароўя, усяго найлепшага. Дзеці, унукі Мяланічы

**Алеся Пілецкага**, першага беларускага чалавека на курсе, у першай беларускай газэце з Днём народзінаў віншуе калега па цэху. Андрусь

**Siońnia** ū Alaksandra Pileckaha Dzień narodzinaū. Hetaha Alaksandra varta pavinšavać! Budź zdaroū i nie sumuj! Žaūnier

**«Нашу Ніву»,** любімую газэту, віншую з днём сьвятога Валянціна. Уладзіслаў

**Алесю**, мала таго што ў лютым, дык яшчэ і 13-га. Але гэта добрая падстава раззлавацца. Андрусь

### КАНТАКТЫ

**Высокаадукаваны** самастойны хлопец пазнаёміцца зь дзяўчынай. Магчымы шлюб. Т. (у Пружанах): 2-39-64. Зьміцер

**Вальжына!** Не намачыце нос у лютаўскай слоце і не адмарозьце вушэй у сакавіцкую халадэчу. І.Грыбок і Т.Барсук Скамарошкі

**Рок-гурт** шукае бас-гітарыста (узровень не ніжэйшы за сярэдні) з асабістым інструмэнтам і творчым жаданьнем. Т.: 8-029-778-34-22 (Дзіма), 222-72-64 (Каця)

**Горад Ліда.** Клюб гістарычнай рэканструкцыі «Дайнава» шукае сяброў (і ворагаў). Т.: 8-029-612-40-06

**Моладзевая** ініцыятыва «Вока». www.voka.by.ru. Будзем разам!

### КНІГІ

**Прадаю** «Беларускую энцыкляпэдыю», т.3, 20000 рублёў; даведнік «Асьветнікі зямлі беларускай» (2001) — 15000. Т.: 8-029-400-45-91

**Прадам** кнігу В.Ляшук «Вывучэньне беларускай літаратуры ў школе: гісторыка-мэтадычны нарыс». «Уголовный кодекс РБ» (1994, бел-чырвона-белая вокладка, Пагоня). «100 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі» (1993 і 1994). Т.: 265-75-73

**Прэзэнтацыя** анталёгіі даўняй беларускай літаратуры (XI — першая палова XVIII ст.) адбудзецца 13 лютага а 15-й гадзіне ў Дзяржаўным музэі гісторыі беларускай літаратуры (вул. М.Багдановіча, 13). Уваход вольны. Т.: 234-56-21

### ПРАЦА

**Патрэбныя** мэтанакіраваныя і сур'ёзныя партнэры ў бізнэсе (безь фінансавай рызыкі). Т.: 8-029-708-91-37

**Шукаю** прадаўца ў мястэчку Мір для продажу сувэніраў. Вясна—лета. Т.: 8-029-722-33-56, (8-0163) 41-60-59

**Пераклад** зь літоўскай мовы патрабуецца. Т.: 8-029-654-91-14

### ВЕРШ НА КУПОНАХ

Дасылаю Вам пяць купонаў, надрукуйце, калі ласка, «Бывайце здаровы» па-італьянску, якую сьпяваў Вайцюшкевіч на канцэрце 30 студзеня.

Noi Vi auguriamo ricchezza, salute
E ora partiamo, e grazie per tutto.
Montagne e fiumi attraverseremo
La vostra bonta' non mai scorderemo

Godete la vita serena, felice
Mangiate la pizza, formaggi, salsicce.
E quando il freddo d'inverno arriva
Scaldatevi pure con grappa e vino.

Inoltre vogliamo che cresca famiglia
Ne poco, ne meno un'anno — un figlio.
Ma non si dispera per tale fortuna
Se vi riuscite ne far piu' di uno.

La strada da voi conoscendo adesso
Possiamo venir a trovarvi piu' spesso.
Battesimi, nozze e scuse diverse
Per riconfermarvi il rispetto immenso.

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

**Запрашаем на падарожжа 22 лютага** (нядзеля) па Шчучынскім раёне: **Мураванка — Жалудок — Ішчална — Вялікае Мажэйкава — Старыя Васілішкі — Васілішкі — Новы Двор — Ражанка — Шчучын.** У праграме — помнікі архітэктуры ад готыкі і барока да клясыцызму і рамантызму.
Т.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал)

## КОШТЫ

**На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16 рэклямныя расцэнкі:** да 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3498. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 11.02.2004.
Замова № 864.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а